Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 24 (438) | Пятніца, 23 чэрвеня 1939 года | Цана 20 кап.

АЛЯКСЕЙ МАКСІМАВІЧ ГОРКІ

У памяці чалавецтва назаўсёды астанецца сумны чэрвеньскі дзень, калі народы Совецкага Саюза развіталіся з благародным прахам свайго Горкага—вялікага пісьменніка і барацьбіта, гордага буравесніка рэвалюцыі, нястомнага песняра пераможнага соцыялізма.

Фашысцкія наймíты з чорнага трацкісцка-бухарынскага падполля ведалі, як глыбока ненавідзіць іх Горкі. Яны адчувалі, што Аляксей Максімавіч не дасць ім ажыццявіць іх подлыя і каварныя планы. Шпіёны і правакатары з міжнароднай «пятай калоны» фашызма, забойцы Кірава, Менжынскага, Куйбышава абарвалі і жыццё вялікага пісьменніка, трыбуна, гуманіста Аляксея Максімавіча Горкага.

«Пасля Леніна смерць Горкага—самая цяжкая страта для нашай краіны і для чалавецтва». Гэтымі словамі Вячаслава Міхайлавіча Молатава выразіў совецкі народ не толькі свой смутак і боль ад цяжкай страты, але і сваю ацэнку вялікага значэння Горкага для міжнароднага пролетарыята.

Усю сілу свайго геніяльнага розуму аддаў Горкі рабочаму класу. Усю страсць свайго сэрца аддаў ён справе вызвалення працоўнага чалавецтва, справе комунізма. Яшчэ ў далёкія змрочныя часы царызма, калі пануючыя класы тушылі і калечылі чалавечую асобу, калі цвет народа грымеў кандаламі на Уладзімірскім тракце, гінуў у турмах і ссылках,—сын народа Максім Горкі пісаў: «Чалавек—гэта гучыць горда!».

Геніяльны самавучка, які прайшоў цярністы і пакутны шлях ад хлопчыка на пабягушках у абутковым магазіне, пасудніка на параходзе, грузчыка на волжскіх прыстанях, весаўшчыка на чыгунцы да найвялікшага пісьменніка і мысліцеля—Аляксей Максімавіч Горкі ўвабраў у сябе ўсю мудрасць народа, яго думы і спадзяванні, яго любоў і нянавісць. Гэта прывяло маладога Горкага яшчэ ў 1887 годзе ў рэволюцыйны гурток Федасеева ў Казані. Гэта звязала яго на ўсё жыццё з партыяй большэвікоў і яе мудрымі правадырамі Леніным і Сталіным.

Горды сокал, які ў 1895 годзе праспяваў гімн «безумству храбрых» і заклеймíў ганьбай «рожденных ползать» трусоў, малавераў і ныцікаў, у 1901 годзе, напярэдадні першай рэволюцыі, прадсказаў паўстанне народа супроць сваіх прыгнятальнікаў: «Буря! Скоро грянет буря!». Паэт вітае набліжэнне рэволюцыі, ён страсна чакае і заклікае яе: «Пусть сильнее грянет буря!». Праходзіць яшчэ некалькі гадоў і Горкі ўзбройвае пролетарыят выдатным і мудрым творам «Маці»—творам, дзе ўпершыню паказаны рэволюцыянеры-большэвікі, закліканыя гісторыяй перастварыць свет.

Уладзімір Ільіч Ленін уважліва і любоўна сачыў за творчасцю вялікага пролетарскага пісьменніка. «Горкі,—пісаў у 1910 годзе В. І. Ленін,—безумоўна буйнейшы прадстаўнік пролетарскага мастацтва, які шмат для яго зрабіў і яшчэ больш можа зрабіць».

Правадыр працоўных В. І. Ленін усёй сваёй дзейнасцю збіраў, выхоўваў, рыхтаваў сілы рабочага класа, загартоўваў большэвіцкую партыю для рашаючых схватак з капіталізмам, рашуча выкрываў здрадніцкую сутнасць дробнабуржуазных партый, зрываў маскі з усялякіх «друзей народа». Гэта рабіў і Аляксей Максімавіч Горкі сродкамі мастацкага слова, сілай тых вобразаў і тыпаў, якія ствараў ён.

У адрозненне ад свайго папярэдніка, Льва Нікалаевіча Талстога, які маляваў выключныя па сваёй сіле рэалістычныя карціны жыцця і ў той-жа час рабіў з іх вывад аб непраціўленні злу, у адрозненне ад мяшчанскіх клікуш тыпа Леаніда Андрэева, які толькі пужаў чытача,—Максім Горкі актыўна ставіўся да сваёй творчасці, разглядаючы яе, як сродак рэволюцыйнага выхавання працоўных. Выкрываючы нікчэмнасць Шалімавых, Басавых, Самгіных і ім падобных прадстаўнікоў буржуазнай інтэлігенцыі, Горкі кіраваўся толькі адной мэтай: паказаць, што не гэтым бліскучым на выгляд і подлым па самай сваёй сутнасці лізаблюдам і прыхлябацелям пануючых класаў, не гэтым, так званым, носьбітам «крытычнай думкі і чыстага сумлення» належыць гістарычная місія вызвалення чалавецтва. Кожным сваім творам Горкі даводзіў, што гэта місія належыць рабочаму класу, большэвікам,—Паўлу Власаву, яго мацеры, інтэлігенту-марксісту Кутузаву.

Горкі быў перапоўнен свяшчэннай нянавісцю да фашызма і яго трацкісцка-бухарынскіх прыслужнікаў. Вялікі пісьменнік кожным сваім артыкулам заклікаў інтэлігенцыю капіталістычных краін далучыцца да адзінага антыфашысцкага фронта, да барацьбы рабочага класа. Перадавое і прагрэсіўнае чалавецтва прагна ловіла кожнае слова Горкага, лічыла яго сваім настаўнікам, сваім сумленнем.

Горкі з намі! Імя яго пераэкыве стагоддзі. Вялікі пісьменнік жыве сярод нас геніяльнымі творамі, сотнямі выхаваных ім пісьменнікаў і рабселькораў, дзесяткамі арганізаваных Горкім масавых выданняў. Совецкі народ, працоўнае чалавецтва ніколі не забудуць свайго Горкага.

НОВЫЯ ТВОРЫ

Р. Мурашка

ЯНІНА

(Урывак з рамана „Салаўі святога Палікара“)

У серабрыстым моры святла ад месяца патаналі хаты, платы, вуліца і прысады ў Манькоўцы, калі прышла туды Яніна. Ад высокай раскідзістай ліпы на шырокую вуліцу лёг вялікі цень. З таго ценю чутна была гамонка, і толькі яна парушала цішыню. Маўчалі ў дварах сабакі. Цёмнымі вачмі вокан глядзелі на вуліцу хаты і быццам драмалі стоячы. Не рыпелі вароты і дзверы, не бразгалі вёдры пры калодзежах. Не рохкалі свінні, не рыкалі каровы. Спакой злацеў на мяккіх крылах да сэрца Яніны. Кроў роўна, не спяшаючы, цякла ў яе жылах. У сэрцы не было ні гневу, ні крыўды ні на каго і ні за вошта. Бурлівае полымя ў сярэдзіне стухла, і яна спакойнаю і ўціхамíранаю хадою ішла па шырокай роўнай вуліцы Манькоўкі, яе бацькаўшчыны, дзе засталіся яе дзіцячыя гады, гады цьмяных надзей, нейкіх імкненняў і смешнай маленькай радасці. Калі яна вышла з ценю ад ліпы, жаночы голас прыцішана сказаў:

— Гэта-ж, здаецца, Яніна.

І тады другі паклікаў:

— Яніна! Гэта ты?

Яна падышла.

На лаўцы пад ліпаю сядзелі таварышкі яе дзіцячых і дзявочых год: Алімпа — цяпер замужам за Адасем Пунктовічам, намеснікам старшыні сельсовета, і дураватая Іодкава Анэлька, якая нікому не была патрэбна і мусіла гэтак і састарэць дзеўкаю. Алімпа была аднаго году з Янінаю, а Анэлька — на пяць год маладзейшая.

З радасным і прыдуркаватым сваім рогатам Анэлька ўхапіла Яніну за руку і пасадзіла паміж сябе і Алімпы.

— Блукае нямаведама дзе... Адна... Нічога не баіцца — хі-хі-хі! — сціпла пасмейвалася Анэлька, штурхаючы Яніну і шчыпаючы яе.

— Анэлька, баліць, дурная ты! — азвалася ціха Яніна.

— Баліць... Баліць... Я-ж і хачу, каб балела... — казала яна, скубучы тую, дзе пападзе. — Вось і блузку падрала, вунь якая дзірка... Табе не балела тады, як яна падралася, — дурным смехам смяялася Анэлька. Яна вельмі ўзрадавалася, убачыўшы сваю старэйшую таварышку.

Хустачка ў Яніны ад хады з'ехала на патыліцу і густыя чорныя валасы панавісалі на лоб. Анэлька адным махам рукі ссунула хустку зусім на шыю, і гладзіла, і песціла сваю дарагую Янінку. Прыемна адчуваць ёй было хвалісты шоўк чорных і бліскучых валасоў Яніны. Яны былі да таго бліскучыя, што Анэлька нават у цяню ліпы бачыла іх бляск. Яна прыціскалася да іх шчакою і, нюхаючы цёплы пах іх, казала ціха:

— Як яны пахнуць, Яніна, твае валасы. Мужчыны шалеюць, мабыць, гледзячы на цябе.

— Дурненькая ты, Анэлька, — спакойна кажа Яніна. — Пляваць я хочу на мужчын!

Анэлька рагоча на ўсю вуліцу. Рагоча з ёю і высокая, прыгожая Алімпа. Не можа стрымацца і сама Яніна і ціха смяецца з таварышкамі. А Анэлька гладзіць і гладзіць яе па галаве, як маленькую дзяўчынку. І той прыемна, быццам маці гэта гладзіць яе, маці, якая памёрла, калі Яніне было сем год. Яна і не памятае ўжо, гладзіла маці яе так, ці не. Можа маці яе і зусім не шкадавала. Яна не памятае ўжо.

— Анэлька, ты верыш таму, што яна кажа? — рагоча Алімпа і грудзі ў яе трасуцца з рогату і сама яна ўся калоціцца, гэтак насмяшыла яе Яніна.

* * *

— Веру, веру, Алімпачка. Годзе ёй любіць мужчын, я хачу, каб яна любіла цяпер толькі мяне.

— У цябе няма таго, за што любяць жанчыны, — гаворыць Алімпа, і зноў — рогат на ўсю вуліцу.

— Чаго няма — вусоў? А чаму-ж яна жыве з Антосем, ае-ж Антось таксама бязвусы.

Алімпа заходзіцца ад рогату. Але Анэлька не рагоча. Яна люба заглядвае ў вочы Яніне. Яніна таксама не смяецца. Яніна плача. Анэлька прыціскаецца тварам да твару і чуе на сваёй шчацэ слёзы Яніны. Анэлька хапае яе ў абедруч і моцна цалуе.

— Не трэба, Яніна... Ты не злуй на мяне... Я-ж не смяюся з цябе — паглядзі. Гэта Алімпа... Гэта Алімпа дурная смяецца.

— Хай смяецца, — кажа праз слёзы Яніна. — І ты смейся, хай усе людзі, увесь свет смяюцца з мяне.

Яніна сапраўды плача. Алімпа заўважае гэта, не бачачы нават слёз. Яно відно па тым, як шумна дыша тая, як ухапіла ражкі хустачкі і прыціснула да воч.

— Гэта ўсё ты, дурная, — строга гаворыць на Анэльку Алімпа. І пытае: — Яніна, чаго ты? Не трэба, ну не трэба гэтых слёз. Зрабілася што нядобрае ці што? Чаго ты, скажы?

Яніна паволі суціхае. Ёй прыемна чуць руплівыя словы таварышак. Як яны некалі жартавалі, як насміхаліся адна з аднае! Але гэта ўсё было без зла, па-сяброўску. І цяпер яна зла не чуе ў іх словах, толькі ёй от неяк горна зрабілася, што яна не магла вытрываць. Якое-ж дурное сэрца ў гэтага чалавека!

Алімпіна рука дакранаецца да жывата Яніны, а сама яна моўчкі глядзіць, нахіліўшыся, у вочы Яніне. Але тая адмоўна ківае галавою, і Алімпа другой рукой лапае яе па шырокай спіне і гаворыць:

— Ну дык чаго-ж ты?

— Так сабе, — адказвае Яніна, як дзіця. — Больш не буду.

Анэлька выцірае ёй сваёй маленькай рукой шчокі і, цесна прыціскаючыся, шэпча нешта.

— Карова, — гаворыць Алімпа. — Сустрэлася з таварышкамі і разраўлася, як маленькая.

— Ты ведаеш, як мне цяжка было?

І пачынае вярзці нешта такое, чаго і сама не разумее. Яна гаворыць, што Антося ніколі няма дома, што адна яна думае нямаведама што.

— А мо' ён гуляе там з кім, — гаворыць яна і адчувае ўвесь фальш сваіх слоў: ды няхай гуляе, яна будзе толькі рада, калі ён не будзе чапацца, няхай хоць галавою наложыць, дык яна яшчэ паскача на яго хаўтурах. Але вось скажы гэта яе таварышкам, ды ці яны зразумеюць — яшчэ возьмуць ды насмяюцца. Яна і сама не разумее, чаго ёй хочацца, чаго ёй трэба.

— Няхай гуляе, — кажа Алімпа. — І ты сабе гуляй. Ты не можаш пагуляць, ці што. Але ты гэта дурышся толькі дарэмна.

«Вось як яны разумеюць, — думае Яніна,—ну, што ім будзеш расказваць». А яна яшчэ ішла да бацькі. Няўжо яна думала паскардзіцца бацьку на сваё жыццё? Ці не думала яна паскардзіцца на яго за тое, што аддаў яе за гэтага касавокага Салаўя? Дый ці асмеліцца яна сказаць гэта, дый ці таго яна ішла сюды? Яна-ж добра ведае, што бацька хацеў яе аддаць за вучонага ды за такога багатага, як сам. Але ці папытаў ён хоць раз дачку, як тая думае, чаго яна хоча. Не, ён рабіў усё так, быццам яе і на свеце не было. Дык што-ж яна магла сказаць яму, дык што-ж з таго меркавання, ці пачуе ён хоць краем вуха боль яе сэрца. «Гняці ў сваім сэрцы сваё гора, — думае яна.—Як гэта цяжка, калі няма з кім словам абазвацца».

Вось яна ішла сюды са злобаю ў душы на Анішчыкаў, яна нешта такое, здаецца, думала і бацьку сказаць, а бацька мае вока супроць Анішчыка яшчэ здаўна, нездарма пакутуе цяпер Анішчык. Праз каго пакутуе? Праз бацьку. А мо' і праз яе? Зноў прамільгае ў памяці здарэнне на сенажаці чатыры гады таму. Але злабы — дзівіцца Яніна — няма ў яе супроць Анішчыка. Нават нібыта жаль кранае яе сэрца: «За што чалавек пакутуе?» І яна-б цяпер завярнулася ўжо ды пайшла-б назад, каб яе ніхто не ўбачыў, але людзі даведаюцца ад Алімпы і Анэлькаю, што прыходзіла яна і да шмат якіх старых плётак дададуць яшчэ.

Адна рука яе ў анэльчыных руках, а Алімпа нешта гаворыць, што — яна не чуе.

Месяц ужо высока над галавамі, круглы, як сярэбраны рубель, блішчыць ён з высокага цёмнасіняга неба. Відно, хоць іголкі збірай. Сядзела-б сабе ціха вось гэтак Яніна, ні пра што не думаючы, сядзела-б з шырока расплюшчанымі вачыма, убіраючы ў сябе гэтую любую святлыню. Хацелася-б ёй, каб і ў яе на душы было гэтак відно і спакойна на сэрцы, як спакойна на гэтай віднай ад месяца вуліцы.

Яе штурхае пад бок Алімпа.

— Калі ў вас зажынаць думаюць?

«Эх, ізноў» — думае Яніна. «Жніво... Духата... Пявуча рэжа серп... Натомішся, мокрая ўся зробішся... Кінешся з асалодаю пад капою на іржышча... Дабрыня!»

Рукі ўзняліся ўгору і Яніна папягнулася ізноў ды так, што блузка разадралася яшчэ больш.

— Дужая, як кабыла... Сілы няма дзе дзець, зусім разадрала блузачку. Калі ў вас зажынаць будуць? — зноў кажа Алімпа.

— Не ведаю, не казалі.

— А ў нас на ўзгорку можна жаць ужо. Да нядзелі зажнём. Прыходзь на зажынкі. Музыкаў запросім... Прыдуць гарманісты! Скакаць будзем! Эх!

Яніну захапляе настрой Алімпы. Яна з радасцю згаджаецца прыйсці на зажынкі.

— З гарэлкаю пойдзем на зажынкі, — кажа Анэлька. — І адны бабы. Не пусцім ніводнага мужчыны. Самі сабе... Прыходзь, Янінка. Успамяні сваё дзявоцтва.

— Прыду, — ускаквае з лаўкі Яніна.—А цяпер трэба ісці. Дабранач, сястрыцы!

— Дабранач! — адказвае Алімпа.

— Дабранач, Янíначка! — люба пракazвае прыдуркаватая Анэлька.

— Глядзі-ж прыдзі.

— Прыду! — адгукаецца яна і выходзіць з ценю на святло месяца.

Босыя ногі прытка ступаюць па сухой і роўнай, як ток, вуліцы. У ёй гэтулькі бадзёрасці, гэтулькі сілы, дзецца няма дзе ад яе. Быццам падымае яна ў паветра Яніну і ногі яе не дакранаюцца, здаецца, зямлі, быццам крылы выраслі ў яе за плячыма і нясуць дужае маладое цела над гэтым ясным спакоем у нязведаную прыгожую далячынь. У целе такая гнуткасць, быццам ніводнае костачкі ў ім няма. Як лазовы дубец, выгінаецца яна, ідучы, удыхаючы на ўсе лёгкія начное свежае паветра, упіваючыся ім, як маладая за вясельным сталом.

АНАТ. ФІНКЕВІЧ

ЭПІЗОД

Васіль расплюшчыў вочы. У пакоі было цёмна.

Васіль павярнуўся на другі бок. Моцна балела ў грудзях, звінела ў галаве.

«Дзе я», — падумаў Васіль: «— На заставе?». Якаў! — гукнуў ён сябра-пагранічніка. Але ніхто не азваўся.

«— Дзе я, што са мною?».

Васіль пачаў прыпамінаць.

... Ноч. Бязветраная, таежная. Цішыня. Прыслухоўваецца, ходзіць Васіль. Шамаціць сухая трава пад нагамі, шуміць нізкі кедроўнік.

Думае Васіль пра родную вёску на Беларусі. Тысячы кіламетраў аддзяляюць яго ад яе, але і гэта зямля, гэтыя вёскі і сопкі гэтак-жа дарагі і блізкі яму, як і калгасныя палі, што на Захадзе, у Беларусі.

Спыніцца, паслухае Васіль і ідзе далей. Ідзе ціха, асцярожна. Думкі плывуць, плывуць адна за адной, бы празрыстыя хвалі на шырокім Амуры.

Праплывае ў памяці ціхі вечар. Схіліўшыся над кнігай, сядзіць Маруся. На імгненне яна заплюшчвае вочы і думае... Пра што думае? Можа, шмат памылак нарабілі ў дыктоўцы яе вучні, можа, чаго не зразумелі? Гэта яе клопат — яна, настаўніца, адказвае за свой клас.

Маўчыць Маруся. Зараз, мабыць, устане яна з-за стала і пусціць патэфон. Будзе слухаць «Арлёнка» і, пэўна, падумае пра яго, Васіля, што недзе на Ўсходзе. Падумае пра тое, што і ў яе ёсць арлёнак, а ў іх абодвух — арляня, і зваць яго імем іспанскім — Хозэ.

Стаў, пагледзеў Васіль на зямлю: сляды па расе, прайшлі ўдвух...

Асцярожна, не робячы шуму, кінуўся Васіль у тайгу, наўздагон. Доўга бег. Абяссільваў. Хацелася ўпасці на зямлю і хоць хвіліну, адну толькі хвіліну, адпачыць на мяккай траве. Але з'яўляліся новыя сілы, энергія, з'яўлялася думка, што, можа, ад яго, аднаго пагранічніка, залежыць цэласць дзесяткаў заводаў, дарог, залежыць жыццё соцень людзей.

Раптоўны стрэл спыніў яго. У кустах чарнелі дзве постаці.

— Стой! — крыкнуў Васіль.—Сто-ой!

Новы стрэл быў адказам яму. Куля з свістам праляцела над галавою і ўпілася ў дрэва.

Васіль узняў вінтоўку. Гулка прагрымеў стрэл. Адна постаць са стогнам павалілася ў кусты, другая знікла ў цемры ночы.

— Стой! — яшчэ раз крыкнуў Васіль. У момант скінуў ён з плеч шынель і з вінтоўкай у руках кінуўся следам за ўцякаючым.

* * *

Нібы скрозь сон прыпомніў Васіль, як нешта вострае балюча ўпілося ў грудзі, з грудзей пацякла кроў — густая, ліпкая. Прыпомніў, як ён бег, здаганяў парушальніка.

Потым настала ноч.

Васіль адчуваў боль у грудзях, адчуваў, што некуды праваливаецца, ляціць... Хацелася спаць, спаць бясконца. Зліпаліся вочы, цяжэлі рукі, свінцом налівалася галава, — засынаў Васіль.

«Колькі часу прайшло?» — не памятае Васіль, але здагадваецца: многа, вельмі многа. Сёння ён першы раз устаў з пасцелі, загаварыў з доктарам. І ўсё расказаў яму доктар: і як непрытомны ляжаў Васіль у паляўнічай хатцы (тым цёмным пакоі, дзе першы раз апамятаўся ён), і як выклікалі самалёт, прывезлі яго сюды, у Хабараўск, і як зрабілі аперацыю, дасталі кулю з грудзей, выратавалі жыццё...

Многа гаварыў доктар. Слухаў Васіль. Хацелася дзякаваць — горача, ад шчырага сэрца. Але не было слоў, і толькі моцна паціснуў Васіль руку доктару, усміхнуўся і ціха, сам да сябе, прагаварыў:

— Эх, на заставу хутчэй-бы!



І. В. Сталін, К. Е. Варашылаў і А. М. Горкі.
Рысунак мастака А. Яр—Краўчанка (1935 г.).

ЯКУБ КОЛАС

ПЕСНЯ АБ СТАЛІНЕ

Новае сонца над намі ўзышло,
Нашы пуціны сагрэла,
Сталін! Твой розум і сэрца тваё
Край ажывілі знямелы.

Ноч беспрасвецця на векі сышла,
Дзён ліхалецця не стала.
Мудры наш сейбіт! Праменні святла
Сееш ты шчодра і дбала.

Глянеш на гоні, на пожні, лясы —
Ветла глядзяць нашы далі.
З намі спяваюць на ўсе галасы
Песні табе, родны Сталін.

Там, дзе ты кінеш арліны пагляд,
Радасна ўсё ажывае.
Творчая праца, і згода, і лад —
Дружба народаў святая.

Ясная дарогай далей і цвярдзей
Смела ідзем грамадою.
Нас не пужае знань грозных падзей:
Мы, правадыр наш, з табою.

Сілы народа падняў ты з глыбінь,
Сілай сваёю ўзброіў.
Наша краіна — сям'я гераінь.
Слаўнае племя герояў.

За радасць, за шчасце, за светлую шыр
Падзяку прымі, правадыр.

Х. МАЛЬЦІНСКІ

АРЫФМЕТЫКА ЗЯЗЮЛІ

Каб верыць ў арыфметыку зязюлі
(Кукуе: «раз, два, тры, чатыры, пяць»
са смакам),
Мне прышлося-б на зямлі-матулі
Яшчэ пражыць капу гадоў ды з гакам.

Жыве ў нас летам птушка з добрым
сэрцам.
Ці-ж можна не любіць яе за гэта?
Сягоння раніцой у гаі паміж вецця
Зязюля ўмножыла мне ўтройчы зімы
й леты.

— Ку-ку! ку-ку! ку-ку! — не цыфры,
а легенда;
Калі так можа быць, калі так будзе,
Я частку год сваіх аддам ў арэнду
Таварышам і добрым людзям.

Ці падарую зімы, леты, нібы кветкі,
А хто адмовіцца ад год дарэмных?
Гуляю ў росным гаі ля палеткаў,
Лічу гады бярэму за бярэмай.

Я ведаю, што гэта варажба пустая,
Якая ўжо даўно не ў модзе.
Усё-ж ткі арыфметыка зязюлі ў гаі
Любата ды й годзе!

Пераклаў з яўр. мовы З. БЯДУЛЯ.

ВАСІЛЬ ГАБЕЕЎ

ДВА БРАТЫ

У зялёнай дуброве,
Ля быстрай ракі,
Дзе вясенняе вее паветра
Свежай хвойнай смалой,
Свежым ліспем ракіт, —
Дзе спяваюць вясёлыя ветры, —
Нарадзіла матуля двух слаўных сыноў,
Клапатліва іх, родных, расціла.
«Каб, сыночкі, я мела
З вас мужных байцоў,
Вы вучыцеся», — ім гаварыла.
І вучыліся хлопцы. Дужэлі, раслі.
За гадамі праходзілі годы..
Першы стаў у калгасе
Ўзорваць палі,
А другі стаў адважным пілотам.
Другі — свет абляцеў, шляхоў
многа праклаў
Над вялікай зямлёю-планетай.
Па-стаханаўску першы сынок
працаваў, —
Стаў вядомы ў краіне Советаў.

А як годы прышлі,
Слаўны час надышоў
Вартаваці совецкія межы.
Ён пакінуў палі, на граніцу пайшоў—
На Далёкі Усход, край таежны
Гаварыў тады ён да матулі сваёй,
Гаварыў да сваёй ён брыгады:
«Берагчы буду пільна край
родны я свой,
Ад ліхіх, ад варожых нападаў».
Першы сын на далёкай усходняй мяжы
Нясе службу сваю баявую.
І абодва радзімы сваёй рубяжы
На зямлі і ў паветры вартуюць,
Як трывожна гудкі над зямлёй
загудуць
І на нас хто спрабуе напасці,
Пойдуць разам з народам
У бітву браты.
Мужна ленінскі сцяг
Праз бäі пранясуць —
Сцяг радзімы, сцяг сонца і шчасця.

ЛІТАРАТУРНЫЯ ВЕЧАРЫ

МАГІЛЕЎ

З 14 па 18 чэрвеня ў Магілеве працавала брыгада Саюза совецкіх пісьменнікаў у складзе таварышоў У. Фінкеля, К. Цітова і А. Есакова. Брыгада правяла на прадпрыемствах, у адным з калгасаў і ў піонерлагерах літаратурныя вечары.

Працоўныя Магілеўшчыны праявілі вялікую цікавасць да мастацкай літаратуры і аказалі брыгадзе цёплы прыём. Разам з тым неабходна адзначыць, што кіраўніцтва Магілеўскага абкома комсмола вельмі мала дапамагло брыгадзе ў арганізацыі і правядзенні літаратурных вечароў.

ВІЦЕБСК

Брыгада Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР у складзе Юркі Віцьбіча, Эдзі Агняцвет, Матвея Грубіяна і Анатоля Астрэйкі выязджала ў Віцебск для арганізацыі і правядзення літаратурных вечароў.

12 чэрвеня быў праведзен літаратурны вечар для рабочых і работніц фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», 13 чэрвеня — для рабочых і работніц фабрыкі «КІМ» і імя Клары Цэткін.

Брыгада правяла кансультацыю маладых і пачынаючых пісьменнікаў, разам з рэдакцыяй «Віцебскага рабочага» падрыхтавала для газеты літаратурную старонку.

Рэарганізацыя Рускага тэатра

Згодна пастановы Соўнаркома БССР, Упраўленне па справах мастацтваў рэарганізуе Дзяржаўны рускі тэатр БССР. Тэатр папоўніцца 30 выпускнікамі ленінградскага тэатральнага вучылішча. З старога складу трупы захоўваецца вядучая група актораў.

Зменена адміністрацыйнае і мастацкае кіраўніцтва. Дырэктарам тэатра прызначан тав. Сяргееў, намеснікам яго — тав. Нагорскі, мастацкім кіраўніком — засл. арт. БССР Д. А. Орлоў.

ГОРКІ І СОВЕЦКАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ

На працягу ўсёй сваёй творчай дзейнасці Горкі глыбока цікавіўся праблемай інтэлігенцыі. Ён дасканала разумеў, што няма інтэлігенцыі, як адзінага цэлага. Ёсць інтэлігенцыя, якая служыць залатому мяшку. І ёсць працоўная інтэлігенцыя, гатовая аддаць усе свае сілы на служэнне народу.

Горкі назаўсёды прыгвазліў да ганебнага слупа рускую буржуазную інтэлігенцыю. Ён з выключным сарказмам раскрыў усю пустату і нікчэмнасць гэтай інтэлігенцыі ў сваіх памфлетах «Аб чорце», «Яшчэ аб чорце» і «Яшчэ раз аб чорце» і заклэйміў яе пагардлівай мянушкай—«дачнікі». Прыгадаем такія вобразы, як Пётр Бессеменаў з «Мяшчан», Чэркун з п'есы «Варвары», сямейства Бардзіных і Скробатавых у «Ворагах» і, нарэшце, Клім Самгін — вобраз, які з выключнай паўнатой ускрывае здрадніцкую сутнасць буржуазнага інтэлігента.

Горкі паказаў і тых прадстаўнікоў рускай інтэлігенцыі, якія разам з рабочым класам самаадлана змагаліся за перамогу соцыялізма.

Яны ярка паказаны ў аповесці «Маці». Гэта — Нікалай Іванавіч, Ягор Іванавіч, Соф'я, Людміла і іншыя. Яны без хістання ідуць к народу, нясуць яму ідэі барацьбы з самадзяржаўем. Творы Горкага раскрываюць працэс фарміравання новай пролетарскай інтэлігенцыі. Хіба не з'яўляецца малады рабочы Павел Власаў, які ператвараецца ў прафесіянальнага рэволюцыянера, самым яркім прыкладам нараджэння новага інтэлігента? Вобраз рабочага-інтэлігента ёсць і ў п'есе «Мяшчане», — машыніст Ніл.

Усё жыццё Горкі быў страсным рэволюцыйным асветнікам. У адным з сваіх дарэволюцыйных артыкулаў ён гаварыў аб тым, што «самая каштоўная творчая сіла — чалавек: чым больш развіты ён духоўна, чым лепш узброены тэхнічнымі ведамі, тым больш моцная і цэльная яго праца, тым больш ён культурны і гістарычны». Гэту мысль Горкі нястомна прапагандыраваў усё жыццё. Ён марыў аб тым часе, калі вызвалены народ атрымае магчымасць авалодаць найвялікшымі вышынямі культуры, калі ён стане ўладаром і тварцом культурных заваяванняў.

Горкі дажыў да гэтага часу. Ён з велізарнай радасцю вітаў кожнае культурнае дасягненне ў нашай краіне. Сваю літаратурна-публіцыстычную і арганізацыйную дзейнасць ён накіроўваў перш за ўсё на тое, каб садзейнічаць стварэнню кадраў совецкіх інтэлігентаў. Адзін з артыкулаў Горкага так і называецца: «Рабочы клас павінен выхоўваць сваіх майстроў культуры».

Амаль у кожным публіцыстычным артыкуле Горкі закранаў пытанне, якое яго глыбока хвалявала — пытанне аб тым, як працоўны народ, шматмільённае сялянства вылучае з свайго асяроддзя выдатныя кадры работнікаў на фронце культуры. Ён уважліва вывучае, дзе і якім чынам выкоўваюцца гэтыя кадры.

Школай совецкай інтэлігенцыі, і, пры тым, выдатнай школай, Горкі лічыць нашу Чырвоную Армію. У артыкуле «Аб Чырвонай Арміі» (1928 г.) ён пісаў: «Цікава было-б падлічыць, колькі граматных людзей дала вёсцы Чырвоная Армія за гэтыя годы. Колькі з асяроддзя байцоў выхавана старшынь валасных і сельскіх камітэтаў? Колькі байцоў пайшло і ідзе на рабфакі, у ВУЗ'ы, колькі іх працуе ў чырвонаармейскай прэсе, колькі створана з іх высокакваліфіцыраваных рабочых, і наогул: якая цыфра культурных людзей, выхаваных першай, за ўсю трагічную гісторыю Еўропы, сапраўды народнай арміяй...»

У радзе іншых артыкулаў Горкі піша аб другіх формах выхавання культурных кадраў. Велізарнае значэнне ён надаваў шматмільённай арміі рабкораў і селькораў. «Гэта значыць, — піша Горкі, — што народ вучыць, і ён вучыцца свабодна гаварыць аб сабе самім, аб сваіх патрэбах і жаданнях».

Асновай выхавання кадраў совецкіх інтэлігентаў з'яўляецца, гаварыў Аляксей Максімавіч, той факт, што рабочы клас вучыцца кіраваць сваёй дзяржавай. «Рускі рабочы, памятаючы завет свайго правадыра — Владзіміра Леніна, пасля-



А. М. Горкі з сынам Максімам.

хова вучыцца кіраваць дзяржавай — вось факт, значэнне якога нельга праўвялічваць».

Асабліва захапляецца Горкі ростам совецкай жанчыны. Жанчына, у мінулым няграматная і забітая, цяпер узнімаецца да вяршынь культуры. Горкі піша: «Радуе і тое, што жанчыны рабочага класа вучацца расказваць аб сваім катаржным мінулым і што ў нас паяўляюцца такія патрэбныя моладзі кнігі, як, напрыклад, Алены Новікавай, Агрыпіны Карэванавай і Галіны Грэкавай, якая з дзевяці год працавала ўжо батрачкай у багацеяў, кубанскіх казакаў, а цяпер выкладае філасофію ў вузах».

Ператварэнне ўчарашніх батракоў, грузчыкаў, слесараў у прафесараў, артыстаў, мастакоў, інжынераў Горкі адзначаў заўсёды з велізарнай радасцю. З гордасцю і шчасцем ён заяўляе ў адным з сваіх пісем: «Радасна жыць і змагацца ў краіне, дзе вялікая мудрасць партыі і жалезная воля яе правадыра Іосіфа Сталіна вызваляе чалавека ад праклятых звычак і прадрассудкаў мінулага».

І сам Горкі з'яўляецца яркім прадстаўніком новай, народнай соцыялістычнай інтэлігенцыі. Сын абойшчыка і збяднеўшай ніжагародскай мяшчанкі, ён не меў доступа ў школы і ўніверсітэты. Вышаўшы з народных нізоў, ён упартай працай, перамагаючы цяжкасці капіталістычнага прыгнёту і паліцэйскага праследвання, узняўся на вяршыні сусветнай культуры, стаў найвялікшым пісьменнікам сваёй эпохі.

Вобраз Горкага — сына народа—прыклад для кожнага совецкага чалавека. І калі мы чытаем натхняючыя словы таварыша Сталіна, сказаныя ім на XVIII з'ездзе ВКП(б): «Мы маем цяпер шматлікую, новую, народную соцыялістычную інтэлігенцыю», мы гаворым, што ў гэтым велізарным сусветна-гістарычным дасягненні ёсць не малая заслуга Аляксея Максімавіча Горкага.

Гр. ЛЕВІН.

„Апошнія“ М. Горкага на калгаснай сцэне

Вялікім поспехам карыстаецца арганізаваны ў калгасе імя Максіма Горкага Варатынскага сельсовета Бабруйскага раёна драмгурток. У яго складзе—18 маладых калгаснікаў. Гурток паставіў тры п'есы, у тым ліку «Салавей» Зм. Бядулі.

Гуртком кіруе настаўнік няпоўнай сярэдняй школы Г. І. Антановіч.

Зараз гурток рыхтуе п'есу М. Горкага «Апошнія».

І. П. СТЭЛЬМАК.

В. КУДЗІМАЎ

Пісьмо ад Горкага

Год дванаццаць назад, у Іркуцку, сядзелі мы з сябрам-сібіракам на гарадской плошчы, ля помніка аднаму з рускіх цароў. Сябра мой лічыў сябе маючым дачыненне да літаратуры. Мітусліва кружачыся вакол пастамента, ён стукаў па граніту кіёчкам і ганьбіў мае вершы. Я адчуваў, што вершы дрэнныя, але як лепш пісаць — не ведаў.

— Трэба, каб пачуццё было. Разумееш ты, воўк смаленскі? Я хачу, каб мяне, чытача, брала за дзевятае рабро. А гэта хіба вершы? — ён спыніўся на хвіліну і знарок гнусава прачытаў:

Падают с крыши капли,
Падают с крыши весной,
Эти стихи о пакле
И о сестре родной...

— Гэта-ж не вершы, а... — ён ужыў моцны выраз і дадаў штосьці па-французску. Мне стала сорамна.

Я быў такі наіўны, што не здагадваўся, ці можна кароткае апавяданне пісаць месяцамі. У тыя дні, начытаўшыся да адурэння, ці стаміўшыся ад пісання вершаў, я спаў неспакойна. Здавалася, напішу я прыгожымі словамі апавяданне аб тым, чаго астатнія людзі не бачаць і не разумеюць. Але тое, што ў думках здавалася такім лёгкім, на справе было амаль невыканальным.

Здаўна хвалявалі мяне Горкі. Пісаў ён нібы і аб простых рэчах, а ў той-жа час гэтыя простыя рэчы мелі незвычайную значымасць, пераканальнасць.

І вось, пасля доўгіх хістанняў і пошукаў, аднойчы ў марозную ноч я сеў да стала пісаць апавяданне.

На наступны дзень у гарадскім садзе я прачытаў сваё апавяданне Лёшку. Лёшка схапіў мой рукапіс, пералістаў і сказаў:

— Выдатна, вельмі добра! Крыху пад Горкага, але цудоўна, не чакаў... Але чагосьці нехапае, няма «ізюмінкі»...

Прайшоў год. Неяк у момант стомленасці і нездаволенасці сабой, у мінуты, калі нямілым робіцца белы свет, я напісаў пісьмо Горкаму.

Прайшоў значны час. Я паехаў у Смаленск. І вось, аднойчы прышоўшы з працы, я ўбачыў у руках жонкі чырвоны канверт.

— З Італіі — сказала яна чамусьці шэптам.

— Што!?

— Ад Горкага... Ты ведаеш, я ўскрыла, я не магла...

Заныла сэрца, як быццам у чаканні чагосьці катастрафічнага, і ў той-жа час узнік мыслены папрок: зачым гэта, зачым?.. Таксама шэптам спытаў:

— Ну?

— Так сабе. А папера выдатная, з вадзянымі знакамі.

— Эх, ты... вадзяны знак! Ніколі не ўскрывай пісьмаў!

— Выбачай...

Спачатку здавалася, што пісьмо будзе даўгое, падрабязнае. Радкі скакалі перад вачыма, сэрца білася і дрыжалі рукі. Сэнс не мог дайсці да свядомасці, асабліва першыя словы: «Апавяданні дрэнна зроблены». Дрэнна, дрэнна... зроблены... А што такое «зроблены»? — хіба апавяданне — рэч? Значыць, тэма, матэрыял — не дрэнныя, а толькі праца?.. Значыць, таму, што я расказваў, ён усё-ж паверыў, а дрэнная толькі праца? Але апавяданне-ж першае...

— Ага, вось бачыш! «Так, як пішаце вы, пісаў у 60-х гадах Нікалай Успенскі», — разумееш, першае апавяданне і — Нікалай Успенскі!..

— Глеб Успенскі.

— Тут Нікалай.

— Значыць апіска.

Недарэчнае невуцтва. Але з песні слова не выкінеш, — я не ведаў, што апрача Глеба існаваў і Нікалай Успенскі.

Паглядзеў свой рукапіс. Ён быў дасканала, як вучнёўскі спытак, выпраўлены. Спачатку здалося дзіўным, што праўка зроблена рознакаляровымі алоўкамі і чарнілам. Але пазней, разбіраючыся ва ўсіх стрэлках, падкрэсліваннях і зносках, пачаў я, хоць і з цяжкасцю, разумець, як трэба «рабіць» апавяданне. Гэта лаканічнае пісьмо адыграла і яшчэ доўга будзе іграць сваю ролю для мяне. Мудрасць пісьма, як і ўсякая мудрасць, была простай. Прастата-ж, як вядома, дасягаецца з вялікай цяжкасцю. Гэты вялікі чалавек сярод шматлікіх сваіх клопатаў і працы знайшоў час указаць мне лаканічна, але зразумела, што рабіць трэба вось так, а не інакш. Гэта было сказана без усякіх скідак і фальшы і, ў той-жа час, не зневажаючы чалавечай годнасці маладшага: «Калі жаданне пісаць — у вас сур'ёзнае жаданне, чытайце Чэхава. — Гэта навучыць вас сцісласці, кароткасці, эканоміі слова».

Мастацтва — подвіг усяго жыцця. Гэта давёў нам Горкі. І непаўторны яго подвіг абавязвае нас да многага. Любіць радзіму, ненавідзець усё, што перашкаджае яе росквіту — вось мае абавязацельствы ў творчасці і жыцці.



А. М. Горкі ў 1903 годзе.

ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ АБ ГОРКІМ

З Чырвонай Арміяй Горкі быў звязан кроўнымі узамі. Іменна аб ёй, аб арміі соцыялістычнай радзімы, была яго апошняя мысль, калі за некалькі хвілін да смерці ён усхвалявана гаварыў: «Будуць войны. Трэба рыхтавацца. Трэба быць зашпіленым на ўсе гузікі».

Чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі любяць бессмяротнага Аляксея Максімавіча як бацьку, настаўніка, друга. Яны заўсёды выражалі і выражаюць сваю любоў і павагу да яго.

Байцы Маскоўскага гарнізона падаравалі яму дробнакаліберную вінтоўку з надпісам: «Трапнаму стралку за новага соцыялістычнага чалавека — Максіму Горкаму ад стралкоў Пролетарскай дывізіі баявое прывітанне!».

Арыгінальны падарунак прынеслі і кавалерысты: шчотку, скрабніцу і шпоры. Да падарунка адзін з чырвонаармейцаў напісаў пяць радкоў верша:

Кавалеристы-военкоры
Подарок припасли таков:
Щётку, скребницу и шпоры.
Пусть чистит мир от барской своры
Железом и щетиной слов.

Велізарную любоў Чырвонай Арміі да Горкага паказваюць і іншыя факты. Менскі Дом Чырвонай Арміі звярнуўся ў інстытут сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага з просьбай прыслаць перасоўную выстаўку, прысвечаную жыццю, творчасці і рэволюцыйнай дзейнасці вялікага народнага пісьменніка — Аляксея Максімавіча Горкага.

Зараз гэта выстаўка адкрыта ў менскім Доме Чырвонай Арміі. Выстаўка ярка паказвае байцам, камандзірам і палітработнікам, як жыў і змагаўся Горкі, як ён рука ў руку з правадырамі працоўнага чалавецтва Леніным і Сталіным змагаўся за пабудову комуністычнага грамадства.

Выстаўка сустрэта з вялікай радасцю і задавальненнем. Шматлікія водгукі наведвальнікаў выстаўкі паказваюць гарачую любоў совецкага народа да свайго геніяльнага мастака. Разам з тым выстаўка выклікае пачуццё вялікай нянавісці да агідных ворагаў чалавецтва, мярзотнай зграі трацкісцка-бухарынскіх вырадкаў, якія пасягнулі на жыццё вялікага Горкага. Вобраз Аляксея Максімавіча, які ўзнікае пры вывучэнні матэрыялаў выстаўкі, аглядзе дакументаў і ілюстрацый, абуджае пачуццё законнай гордасці за сваю соцыялістычную радзіму, за свой народ, які нараджае такіх тытанаў, як Горкі.

Выстаўку наведалі 25 тысяч чалавек працоўных Менска, ваеннаслужачых, членаў іх сямей. Запісана звыш 200 выказванняў аб выстаўцы.

Чырвонаармеец тав. Галубчыкаў піша: «Прагледзеўшы выстаўку, прысвечаную жыццю і дзейнасці А. М. Горкага, я яшчэ больш адчуў сілу яго твораў, велізарную плённую працу, якую ён аддаў на карысць народа, сваёй соцыялістычнай радзімы. На выстаўцы я быццам сустрэўся з жывым Горкім, слухаў яго пяшчотныя, задушэўныя словы, глядзеў яму ў твар, у чыстыя яго вочы. Калі-б я мог пісаць вершы, я стварыў-бы аб Горкім лепшыя песні! Горкі — самы любімы з любімых пісьменнікаў, родны, блізкі. Я не забуду свайго любімага пісьменніка ніколі! Выстаўка, прысвечаная яго жыццю, пакінула цудоўнае ўражанне!»

Чырвонаармеец тав. Ражкоў піша: «Аляксей Максімавіч Горкі—вялікі і цудоўны чалавек нашай эпохі. Паказаць шматграннае жыццё гэтага выдатнага пісьменніка-рэволюцыянера — нялёгкая задача. Арганізатары выстаўкі справіліся з гэтай задачай. Выстаўка зрабіла на мяне моцнае ўражанне. Уходзячы з выстаўкі, хочацца сказаць: «Горкі жыў і будзе жыць у народзе цэлыя стагоддзі. Прэзрэнныя казяўкі—трацкісты і бухарынцы пралічыліся. Горкі жывы!».

Чырвонаармейцы т.т. Стружкін і Анісімаў напісалі: «Любоў да вялікага пісьменніка жыве ў нашых сэрцах і вельмі прыемна адчуць яе яшчэ раз, наведаўшы гэту выстаўку, з такой дасканаласцю і з такой любоўю выкананую».

Ваенны інжынер тав. Пасадны піша: «Цудоўная выстаўка! Тут за кароткі час можна ўбачыць увесь жыццёвы шлях найвялікшага совецкага пісьменніка. А ведаць жыццё гэтага чалавека павінен усякі, каму дарагі заваёвы нашай краіны, бо Горкі ўсё сваё жыццё аддаў барацьбе за шчасце народа».

Капітан-ордананосец тав. Ваксін указвае, што ён «з вялікай увагай праслухаў на выстаўцы лекцыю аб жыцці і творчасці Горкага. Выстаўка шмат дае нашым камандзірам, байцам у справе азнаямлення з вялікім пісьменнікам. Лічу неабходным, каб Дом Чырвонай Арміі арганізаваў калектыўныя чыткі твораў Горкага».

Малодшы камандзір тав. Акапян, убачыўшы на выстаўцы кнігу Горкага на армянскай мове, быў вельмі ўзрадаваны. Двойчы прыходзіў ён на выстаўку чытаць гэтую кнігу. Чытаў яе ў голас, шчасліва ўсміхаўся і гаварыў:

«— Горкі! Ён наш. У нас быў. Як піша!».

Выстаўка была вывезена на тры дні ў адну з часцей гарнізона. Чырвонаармейцы і камандзіры аднадушна адзначалі вялікае культурна-палітычнае значэнне выстаўкі. «Выдатнае жыццё пражыў Горкі!.. Выстаўка ўзбагаціла нашы веды», — гаварылі наведвальнікі выстаўкі.

Л. ШАПІРА.

Вечар памяці А. М. Горкага

18 чэрвеня ў Зялёным тэатры менскага парка імя А. М. Горкага адбыўся вялікі гарадскі вечар, прысвечаны памяці вялікага совецкага пісьменніка Аляксея Максімавіча Горкага, злачынна ўмярцвёнага трацкісцка-бухарынскімі бандытамі.

На вечар прышлі стаханаўцы менскіх прадпрыемстваў, прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі, байцы, камандзіры і палітработнікі менскага гарнізона.

У прэзідыуме — народны паэт ордананосец Якуб Колас, пісьменнік-ордананосец Міхась Лынькоў, пісьменнік Міхась Клімковіч, паэтэса Э. Агняцвет, настаўнік тав. Посах і інш.

З цікавым і змястоўным дакладам аб жыцці і творчасці М. Горкага выступіў супрацоўнік Інстытута сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага тав. Левін.

Народны паэт Якуб Колас і пісьменнікі М. Лынькоў і М. Клімковіч расказалі прысутным пра свае сустрэчы з А. М. Горкім у Маскве ў часе работы першага з'езда совецкіх пісьменнікаў.

Настаўнік рабфака тав. Посах падзяліўся з прысутнымі ўражаннямі аб сваёй сустрэчы з А. М. Горкім на востраве Капры. Гэта сустрэча адбылася ў часе, калі тав. Посах разам з групай настаўнікаў быў у замежным падарожжы.

— Нас, настаўнікаў, вельмі ветліва сустрэў Аляксей Максімавіч. Мы яго запрасілі да сябе. Аляксей Максімавіч прышоў да нас са сваім сынам і жонкай. Ён папрасіў нас праспяваць беларускія народныя песні і пачытаць беларускія вершы. На развітанне А. М. Горкі запытаўся, ці можам мы яму прыслаць некалькі беларускіх кніг. Па прыездзе на сваю радзіму, мы паслалі Аляксею Максімавічу зборнік вершаў «Жалейка» Янкі Купалы і «Песні жальбы» Я. Коласа. Неўзабаве ў «Журнале для всех» з'явіўся артыкул пра гэтыя зборнікі. А. М. Горкі яшчэ тады высока ацаніў творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа.

На гэтым вечары паэтэсы Сара Каган і Эдзі Агняцвет прачыталі свае вершы, прысвечаныя А. М. Горкаму.

Вечар закончыўся вялікім канцэртам, прысвечаным А. М. Горкаму.

Я. А.

І. СЯРЭБРАНЫ

М. ГОРКІ І ЯЎРЭЙСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Вялікая роля належыць А. М. Горкаму ў барацьбе прыгнечаных і бяспраўных народаў царскай Расіі за сваё вызваленне. Яшчэ да Кастрычніцкай рэволюцыі Горкі абвясціў ва ўвесь голас:

«Рускую зямлю насяляюць звыш ста рознамоўных, рознаверных народнасцей; людзей дзяржаўнага вялікарускага племені толькі пяцьдзесят пяць мільёнаў з ста сямідзесяці,—ці-ж не ясна, што нашым культурным лозунгам павінен быць лозунг—свабода і адзінства?»

Пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, калі Горкі становіцца на чале совецкай літаратуры і з'яўляецца адным з актыўнейшых будаўнікоў соцыялістычнай культуры, ён піша ў пісьме «К рабкорам і пісьменнікам»:

«Неабходна ўзаемна абмяняцца веданнем мінулага для ўсіх саюзных рэспублік, трэба, каб беларус ведаў, што такое грузін, цюрк і іншыя, а ўсе іншыя ведалі, што такое украінец, беларус, узбек, татарын і г. д.».

Тое-ж гаворыць Горкі і на першым Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў. Радам фактаў ён ілюстрыруе сваю мысль аб тым, што «колькасць народа не ўплывае на якасць яго талентаў».

Соцыялістычны гуманізм і інтэрнацыяналізм Горкага ўсюды ярка выражаны і павучальны.

Нездарма імя Горкага дорага і блізка шырокім масам яўрэйскага народа. Ён увайшоў у быт яўрэйскіх працоўных мас, як сімвал вызвалення.

Геніяльны Шолам-Алэйхем першым мастацка зафіксіраваў авеяны рамантыкай вобраз Горкага, якім яго ўяўляла яўрэйская дэмакратычная моладзь. У вядомым творы Шолам-Алэйхема «Тэв'е-малочнік» ёсць вобраз дачкі Тэв'е—Хавы, якая закахалася ў пісара воласці Федзьку Галагана. І калі гэта дачка вясковага яўрэя-працаўніка хоча апраўдаць сваё каханне да Федзькі і ўзвысіць яго ў вачах бацькі, яна з гордасцю заяўляе:

«Федзька, — гаворыць яна, — гэта другі Горкі».

Але гэты «аргумент» дачкі—непераканаўчы для Тэв'е. «Другі Горкі?—гавару я,—кім-жа быў, гавару я, першы Горкі?»—«Горкі,—гаворыць яна,—гэта цяпер амаль першы чалавек на свеце...» «Дзе жыве ён, гавару я, твой танай (настаўнік), чым ён займаецца і якую пропаведзь ён сказаў?..» І гаворыць яна мне: «Гэты Горкі — вядомы пісьменнік, тварэц, гэта значыць чалавек, які робіць кнігі, і мілы, цудоўны, сумленны чалавек, таксама паходзіць з простага люду, нідзе не вучыўся, толькі сам ад сябе... вось гэта яго партрэт...» Так гаворыць яна мне, Хава, значыць, і выймае з кішэні партрэцік і паказвае яго мне».

Горкаўская лінія ў літаратуры патрабавала перш за ўсё ідэйнай накіраванасці, соцыяльнай насычанасці і рэалістычнага адлюстравання жыцця, патрабавала барацьбы супроць розных дэкадэнцкіх школ і школак. Можна назваць многіх яўрэйскіх пісьменнікаў, якія ў пэўны перыяд часу імкнуліся наблізіцца да гэтай горкаўскай лініі. І. Л. Перац у 90-х годах быў захоплен рабочым рухам. У гэты час ён спачувае ўсім прыгнечаным і зняважаным, выдае свае «Святочныя старонкі», піша свае лепшыя рэалістычныя навелы, у якіх паказвае вобразы прадстаўнікоў беднаты, малюе сцэны з жыцця «сутарэнняў», апісвае горкі лёс прыгнечанай яўрэйскай жанчыны, піша свае соцыяльна-завойстраныя артыкулы і фельетоны, антырэлігійныя сатыры і эпіграмы. Пазней Перац адыходзіць ад гэтай лініі. У час рэволюцыі 1905 года ён зноў спрабуе падыйсці да горкаўскай лініі: піша ўзнёслую рэцэнзію аб п'есе Горкага «На дне», якую тады ставілі ў яўрэйскім тэатры (1906 г.). Ён і сам спрабуе пісаць на старажытнай яўрэйскай мове п'есу, падобную да «На дне» і аналагічную аднаактоўку «Сёстры» на яўрэйскай мове.

Больш цікавы і жыццёвы ўзаемаадносіны Горкага і Шолам-Алэйхема. Вядома, што нават такі пісьменнік, як Шолам-Алэйхем, не мог у сваёй творчасці ўзняцца да горкаўскага разумення рэчаіснасці. Яму нехапала перш за ўсё палітычнай школы Горкага—школы ленінска-сталінскай партыі, нехапала арганічнай блізасці з рабочым рухам і соцыяльнай базы творчасці Горкага.

Якія-ж прычыны блізкасці і цеснай сувязі Горкага і Шолам-Алэйхема? Адной з прычын з'яўляецца тое, што Шолам-Алэйхем, не гледзячы на ўсе хістанні, заўсёды быў і застаўся рэалістам, праціўнікам рэакцыйных літаратурных плыней, якія асабліва расцвілі ў годы рэакцыі.

Інтарэсы абодвух пісьменнікаў скрыжоўваюцца. Горкі — самы энергічны збіральнік усяго здаровага і жыццёвага ў літаратуры таго часу—знайшоў у асобе Шолам-Алэйхема свайго саратніка. Ён вельмі высока цаніць талент Шолам-Алэйхема. Гэта відаць з яго ацэнкі творчасці Шолам-Алэйхема, з яго цёплых, таварыскіх адносін да самога Шолам-Алэйхема.

Аб сваёй першай сустрэчы з Горкім Шолам-Алэйхем з захапленнем піша сваёй дачцы Эрнестыне:

«Сёння я вам усім пісаў аб маім першым візіце да Максіма Горкага, які прыняў мяне вельмі па-сяброўску, чыста патаварыску і зачараваў мяне».

У асобе Горкага Шолам-Алэйхем бачыў аднаго з ідэальных і выдатных прадстаўнікоў рускага народа і рускай літаратуры. Ён піша да свайго сябра:

«Вы ведаеце, выдатныя людзі іншых нацыянальнасцей пачалі да нас прыглядацца, прыслухоўвацца і цікавіцца: адзін з іх—чалавек з цудоўным пяром, тытанічным талентам і залатым сэрцам—Максім Горкі—узяўся за нас не на жарты. Будзе выдан на рускай мове даволі вялікі зборнік выключна яўрэйскіх рэдкасцей, асабліва з жаргона, у перакладзе на рускую мову...»

Тут гутарка ідзе аб зборніку твораў яўрэйскіх пісьменнікаў пад рэдакцыяй Шолам-Алэйхема, які Горкі меркаваў выпусціць у сваім выдавецтве «Знание». Гэта між іншым толькі адно са шматлікіх мерапрыемстваў Горкага, які словам і справай імкнуўся наблізіць яўрэйскую літаратуру да рускага чытача. Горкі садзейнічаў перакладу лепшых твораў яўрэйскіх пісьменнікаў на рускую мову, і ён, як вядома, з'яўляецца першым, хто напісаў захапляючы водгук аб першым томе твораў Шолам-Алэйхема на рускай мове—«Дэеці мяжы аседласці» («Хлопчык Мотл»).

У творчасці Шолам-Алэйхема, ў яго выказваннях ёсць рад рысаў, якія пераклікаюцца з горкаўскай творчай сістэмай і эстэтычнымі прынцыпамі.

І шолам-алэйхемаўская «касрылаўка» мае шмат агульнага з горкаўскай «окураўшчынай». І тут і там адлюстравана своеасаблівае захалусце царскай Расіі. Як «маленькія людзі» Касрылаўкі, так і мяшчане Окурава не ведаюць, куды падзець сваю энергію і сум, яны адарваны ад усяго акаляючага (усе яны ўпэўнены, што на іх, уласна кажучы, трымаецца ўся Расія і ўвесь свет). Яны жывуць толькі чуткамі і не вераць ні ў якія навіны, хоць гэтыя навіны і даходзяць да іх. У «Пагарэльцах з Касрылаўкі» Шолам Алэйхем дае вельмі характэрную сустрэчу ў цягніку «выбраных» людзей Касрылаўкі з некаторымі тыповымі прадстаўнікамі Окурава.

П'еса Шолам-Алэйхема «Рассеяны і развеяны» напісана пад непасрэдным уплывам п'есы Горкага «Мяшчане». Некаторыя прынцыповыя выказванні Шолам-Алэйхема амаль поўнасцю супадаюць з выказваннямі Горкага па тых-жа пытаннях. Шолам-Алэйхем піша ў сваім пісьме к сыну, што «усё залежыць ад жадання. Нават тое, што людзі бачаць ва мне таленавітага, я называю толькі жаданнем заўсёды хацець».

Гэта думка пераклікаецца з неаднаразовымі выказваннямі Горкага аб значэнні ўпартай і сістэматычнай работы над сабою для кожнага мастака.

Совецкая яўрэйская літаратура, як і літаратуры ўсіх народаў вялікага Совецкага Саюза, вырасла пад непасрэдным кіраўніцтвам Горкага.

Такі твор, як «Ля Дняпра» Бергельсона—адзін з буйнейшых і лепшых твораў нашай совецкай яўрэйскай прозы,—блізкі па асноўнай ідэі да горкаўскай аповесці «Справа Артамонавых».

Трацкісцка-авербахаўскія і нацыяналістычна-буржуазныя шкоднікі вялі правакацыйную работу ў яўрэйскай літаратуры. Яны ўсімі сродкамі імкнуліся зменшыць уплыў Горкага на совецкую яўрэйскую літаратуру.

Вялікая спадчына Горкага—не аб'ект механічнага капіравання, а крыніца вялікага гістарычнага і творчага вопыту, асабліва для нашых маладых пісьменнікаў, шлях да авалодання соцыялістычным рэалізмам, якім прасякнута ўся творчасць Горкага.

Літаратурныя запаведзі Горкага—гэта запаведзі, якія служаць працоўнаму народу, пролетарскай барацьбе, комунізму. Яны павінны захоўвацца кожным совецкім пісьменнікам.



«Таварышы **Варашылаў, Будзённы** і **Шчадзенка** ў часе атакі»—эскіз скульптара **Глебава** для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Фота І. Каплінскага.

РОСТ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ КАНСЕРВАТОРЫІ

Партарганізацыя Белдзяржкансерваторыі за апошнія 6 месяцаў вырасла на 7 чалавек. У партыю прыняты дацэнт кансерваторыі тав. М. А. Бергер, які вылучан нядаўна дырэктарам кансерваторыі, педагог па гісторыі музыкі тав. Б. С. Смольскі, засл. арт. рэсп. А. Л. Бяссмертны, педагог кансерваторыі, І. Б. Зегер — студэнт кансерваторыі, добры грамадскі дзеяч, старшыня прафкома кансерваторыі і музычнага вучылішча, І. Г. Герман—сакратар камсамольскай арганізацыі кансерваторыі і музычнага вучылішча, Б. С. Каваленак — студэнт кансерваторыі і Р. З. Крыцэр — сакратар вучэбнай часткі кансерваторыі, член ЛКСМБ. Усе гэтыя таварышы былі прыняты ў індывідуальным парадку, згодна статута ВКП(б). Хаця па прыёму ў партыю і была праведзена некаторая работа, але трэба сказаць, што мы яшчэ не ўсё зрабілі па ўцягненню і адбору лепшых людзей нашага калектыва ў рады ВКП(б).

Для ўзняцця ідэйна-палітычнага ўзроўню членаў і кандыдатаў КП(б)Б, студэнтаў і прафесарска-настаўніцкага складу арганізоўваюцца ў дапамогу самастойна вывучаючым гісторыю ВКП(б) лекцыі, даклады. Праведзены дзве тэарэтычныя канферэнцыі па 1-му і 2-му раздзелах «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Нажаль, яшчэ не ўсе настаўнікі і студэнты па-сапраўднаму прыступілі да сістэматычнай работы па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». На гэта партарганізацыі неабходна звярнуць асаблівую ўвагу.

Для ўзняцця якасці вучобы і паспяховасці студэнтаў кансерваторыі і музычнага вучылішча, па ініцыятыве партарганізацыі і дырэкцыі, было разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва як паміж кафедрамі, так і паміж педагогамі і студэнтамі. Калектыў кансерваторыі заключыў соцыялістычны дагавор з Кіеўскай ордэна Леніна кансерваторыяй. Гэта спаборніцтва спрыяе ўзняццю якасці вучобы. Маркуючы нават па папярэдніх даных залікаў і экзаменаў. мы пераконваемся, што ўзровень паспяховасці ў гэтым годзе значна вышэй мінулагодняга.

Вялікая работа была праведзена партарганізацыяй сярод студэнтаў у інтэрнатах, а таксама сярод настаўнікаў кансерваторыі. Праведзены гутаркі аб міжнародным становішчы, аб рашэннях XVIII з'езда ВКП(б) і інш.

Партарганізацыя шмат увагі ўдзяліла абароннай рабоце. Да адкрыцця XVIII з'езда ВКП(б) здалі норму ГПА І ступені — 70 чал., варашылаўскіх стралкоў І ступені — 15 чалавек. 13 чалавек атрымалі права вадзіцеляў матацыкла. Усе члены і кандыдаты ВКП(б) рыхтуюцца да здачы норм на варашылаўскага стралка II ступені.

Кансерваторыя была ініцыятарам правядзення ўсебеларускіх завочных стралковых спаборніцтваў сярод навучальных устаноў. У гэтых спаборніцтвах Белдзяржкансерваторыя заняла першае месца і была прэміравана Упраўленнем па справах мастацтваў.

У сучасны момант перад партыйна-камсамольскай арганізацыяй, прафкомам і дырэкцыяй стаяць дзве вялікія задачы—па-сапраўднаму арганізаваць летні адпачынак студэнтаў і педагогаў кансерваторыі і музычнага вучылішча, правесці адбор таленавітых людзей для ўкамплектавання кансерваторыі і музычнага вучылішча ў новым навучальным годзе.

І. М. БРАНЦ,
сакратар партарганізацыі Белдзяржкансерваторыі.

НОВЫЯ КІНО-НАРЫСЫ

Паводле задання выстаўкома БССР Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, Менская студыя кінохронікі заканчвае дакументальны нарыс «Савецкая Беларусь». Нарыс пазнаёміць наведвальнікаў выстаўкі з калгасамі, саўгасамі, заводамі, фабрыкамі, гарадамі БССР. Значнае месца ў нарысе займае мастацкая самадзейнасць калгаснікаў. Заснята выступленне ансамбля песні і пляскі Асінторфа пад кіраваннем калгасніцы Курачкінай.

Адначасова Менская студыя кінохронікі зробіць дакументальны нарыс на тэму: «Адроджанае Палессе». У нарысе будзе паказан соцыялістычны росквіт нашага Палесся, яго багацці, заможнае жыццё рабочых і калгаснікаў. Сцэнарны план нарыса піша малады беларускі пісьменнік Краўчанка. Фільм аб Палессі будзе закончан у верасні.

Пачынаецца работа над нарысам «Калгас — крэпасць абароны». У нарысе будзе паказана ваенна-абаронная работа двух пагранічных калгасаў Полацкага раёна.

Апошнія два нарысы прызначаны для дэманстрацыі на экранах Савецкага Саюза.

Зараз Менская студыя кінохронікі працуе над нарысам аб сцягванні хутароў у калгасныя паселішчы.

ПАСЯДЖЭННЕ ПРАЎЛЕННЯ ССПБ

ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ І ПРЫНЦЫПОВАСЦЬ КРЫТЫКІ

З даклада тав. М. КЛІМКОВІЧА

Тав. Клімковіч коратка спыняецца на тых дыскусіях па пытаннях крытыкі, якія ішлі перад пастаноўкай гэтага пытання на пасяджэнні праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР, у прыватнасці, пасля з'яўлення ў «Праўдзе» артыкулаў тав. Вірты «Аб смеласці сапраўднай і мнімай» і тав. Фадзеева «Комуністычнае выхаванне працоўных і савецкае мастацтва», выступленняў пісьменнікаў у часе абмеркавання пытанняў крытыкі на праўленні Саюза савецкіх пісьменнікаў СССР.

Гэтыя артыкулы і выступленні выклікалі ажыўленае абмеркаванне і ў колах беларускай літаратурнай грамадскасці, — адзначае дакладчык. — Аднак пры агульнай станоўчай ацэнцы саміх артыкулаў і своечасовасці іх з'яўлення, атрымаўся некаторы рознабой у прымяненні іх да нашых беларускіх умоў.

Частка крытыкаў, у прыватнасці, тав. Кучар, зразумелі артыкулы, як неабходнасць заключыць абараніцельны і наступацельны саюз невялікай групы «лепшых» крытыкаў, каб такім чыста ваенным мерапрыемствам змагацца за аўтарытэт і сваё месца «пад сонцам», прадставіўшы астатнім права дзяліць паміж сабою «арыентацыю на асобы і ўстановы», «дзяржаўны дазвол на крытыку», «нівеліроўку літаратуры» і астатнія сем смяротных грахоў і недахопаў, якія былі адзначаны ў артыкуле тав. Фадзеева.

Цяпер аб самой крытыцы. Нашы крытыкі аказаліся працалюбівымі не менш за нашых пісьменнікаў. За год надрукавана звыш ста артыкулаў у газеце «Літаратура і мастацтва», 15 артыкулаў у журнале «Полымя рэвалюцыі», звыш 15 артыкулаў напісана для гісторыі беларускай літаратуры. І ўсё гэта напісана параўнальна невялікай групай крытыкаў—Бярозкіным, Есаковым, Ларчанкам, Модэлем, Кучарам, Вольскім, Шараховскім, Дворкінай, Фіглоўскай, Юдэлевічам, Барысенка, Маслоўскім. Апрача гэтага надрукаван рад артыкулаў у «Звяздзе», у «Советской Белоруссии», у маскоўскай прэсе Як бачым, крытыкі напісалі не менш, чым іншыя пісьменнікі.

Па колькасці работ і рознастайнасці тэматыкі вылучаюцца маладыя крытыкі Г. Бярозкін і А. Есакоў, а таксама таварышы Ларчанка, Дворкіна і іншыя работнікі Інстытута літаратуры і мовы, якія асабліва актывізаваліся ў апошні час.

Наша крытыка даволі чула адклікалася на літаратурныя падзеі: усе больш-менш прыкметныя ў літаратуры творы знайшлі тую ці іншую ацэнку крытыкі. Палова ўсіх артыкулаў прысвечана разбору творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў (найбольш пашанцавала п'есам і пастаноўкам), другая палова дзеліцца паміж юбілейнымі артыкуламі (Шэўчэнка, Горкі, Шолам-Алэйхем, Шота Руставелі, Маякоўскі, Гогаль, Кацюбінскі, Серафімовіч) і гісторыяй беларускай літаратуры. Не абойдзены крытыкай і маладыя пісьменнікі.

Крытыка аказалася даволі рознастайнай і па стылю і па колу чытачоў, якім яна адрасавана. Напрыклад, тав. Бярозкін адрасуе сваю крытыку «інтэлігенцыі сярод інтэлігенцыі», якая добра валодае літаратуразнаўчай тэрміналогіяй (чытачу, які недасканала ведае гэтую тэрміналогію, яго досыць цяжка зразумець). Тав. Ларчанка адрасуе сваю крытыку настаўнікам і студэнтам, часам пакідаючы ў баку тыя пытанні, якія могуць цікавіць выключна пісьменніка. Тав. Дворкіна, Шараховскі, Фіглоўская разлічваюць сваю крытыку на больш шырокае кола актыва. Тав. Модэль — на работнікаў тэатра.

А цяпер пяройдзем да самага галоўнага.

Трэба проста сказаць, што большасць нашых крытыкаў давала творы добраякасныя, якія з задавальненнем сустракаліся чытачамі.

Возьмем артыкул тав. Шараховскага «Горкі і маладыя пісьменнікі». Тав. Шараховскі адбірае з выказванняў Горкага пра літаратурную моладзь з уласнай творчасці Горкага ўсё, што можа пайсці на карысць пачынаючага і маладога пісьменніка. Шараховскі ўсё гэта укладае ў стройную сістэму, піша проста і пераканаўча. Другі артыкул тав. Шараховскага — «Вялікі паэт-грамадзянін» (пра Некрасава). Тут — зноў добра прадуманая паслядоўнасць, сталае абгрунтаванне сваіх палажэнняў і вывадаў, правільнасць метадалогіі ў разглядзе і ацэнках творчасці Некрасава.

Артыкул тав. Фіглоўскай пра Серафімовіча дае дасканалы разгляд творчага шляху пісьменніка, створаных ім вобразаў, тэматыкі яго творчасці. Артыкулы тав. Дворкінай аб Байране, аб паэзіі «Новай Рэйнскай газеты» з вялікай ахвотай і карысцю былі прачытаны і пісьменнікамі і, наогул, інтэлігенцыяй. Артыкул тав. Маслоўскага пра Палежаева дае ўяўленне аб месцы Палежаева ў гісторыі рускай літаратуры, аб яго палітычных поглядах, аб яго мастацкіх сродках.

Возьмем рад артыкулаў тав. Бярозкіна, войстрых, усхваляваных, пра выкладанне беларускай літаратуры ў ВНУ, якое ён назваў «прыкрым непаразуменнем, а не выкладаннем». Тав. Бярозкін рашуча асудзіў рэшткі рапаўскіх ярлычкоў, якія наклейваліся выкладчыкамі на спіны пісьменнікаў, узяў пад абарону рад твораў, якія дагэтуль ацэньваліся адмоўна. У артыкулах тав. Бярозкіна пра творчасць Пятруся Броўкі, пра Аркадзя Куляшова ёсць рад вельмі трапных спроб вызначыць мастацкія асаблівасці гэтых паэтаў.

Тав. Юдэлевіч у артыкуле пра п'есу «Партызаны» Крапівы высоўвае і прапагандуе надзвычай цікавую ідэю паказа маральнай перавагі людзей з народа над сваімі працiўнікамі, зварачваючы гэтым самым увагу ўсіх пісьменнікаў на неабходнасць іменна так паказаць новага чалавека, яго псіхалогію, яго пачуццёвы свет і яго ўчынкі. Гэтую думку потым развіў і дапоўніў тав. Кучар у артыкулах пра творчасць Э. Самуйлёнка, даўшы канкрэтныя прыклады з «Будучыні» і «Пагібелі воўка».

Артыкулы тав. Кучара пра творчасць Самуйлёнка правільна паказвалі вялікі рост гэтага пісьменніка, яго майстэрства.

Тав. Ларчанка напісаў рад каштоўных артыкулаў, якія ўздымаюць пытанні гісторыі беларускай літаратуры. Асобныя промахі і недахопы не зніжаюць значэння яго артыкулаў, у якіх ён па-новаму паставіў пытанне аб Скарыне, аб Будным, аб уплывах старажытнай беларускай літаратуры на тагочасную рускую літаратуру, аб беларускім фальклоры. Разам з тав. Фіглоўскай тав. Ларчанка адшукаў і абнародаваў рад цікавых новых матэрыялаў з гісторыі беларускай літаратуры. Наогул трэба сказаць, што група вельмі скромных, часам незаслужана трапляючых пад абстрэл з боку «старажылаў літаратурнай крытыкі», работнікаў Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР мае безумоўныя заслугі перад беларускай літаратурай.

Артыкулы тав. Вольскага пра п'есу «Партызаны», пра Гейне, пра асобныя спектаклі вызначаюцца дэталёвым і кваліфіцыраваным разглядам твораў. Яны прынеслі безумоўную карысць чытачам. Тое самае трэба сказаць пра рад артыкулаў тав. Модэля, калі адсеяць «пыл эрудыцыі», які часам без усякай патрэбы пускае тав. Модэль перад чытачамі. Яго артыкулы пра юбілейныя спектаклі, пра пастаноўкі Яўрэйскага тэатра і Тэатра оперы і балета безумоўна заслугоўваюць увагі.

Можа не так прыкметна, але верна і ўпарта працуе і прыносіць карысць група маладых крытыкаў (Есакоў і інш.).

Заслугоўваюць увагі спробы нашых крытыкаў прасачыць увесь жыццёвы шлях Купалы, Коласа, Багдановіча, Багушэвіча, Лынькова, Броўкі, Глебкі, Крапівы, знайсці пераклічку іх з сучаснікамі з другіх братніх літаратур.

Наша крытыка становіцца ўсё больш і больш сінтэтычнай крытыкай. Ускрывае, ацэньвае сінтэз мастацкіх форм і палітычных ідэй твора. Адны з крытыкаў больш, другія менш, але ўсе набліжаюцца да гэтай глыбіні крытыкі. Усё больш і больш заваёўвае сабе права эстэтычная ацэнка твора. І хаця асобныя таварышы, лічачы свае эстэтычныя густы непаграшымымі, іншы раз збіваюцца на шлях адмоўных адносін да ўсёй літаратуры праз «нігілістычную» ацэнку твораў амаль усіх беларускіх пісьменнікаў. Аднак і гэта хвароба з цягам часу знікае.

Але мы яшчэ не абыходзімся без кур'ёзаў. Напрыклад, тав. Колас у сваім артыкуле пра творчасць Шэўчэнка і яго ўплывы на беларускую літаратуру, праводзячы прыклады пераклічкі Труса і Шэўчэнка, так нязграбна парафнаў радкі аднаго, ці двух вершаў Труса і Шэўчэнка, што замест адшукання ўплыву абвінаваціў Труса ў плагіяце, чаго на самой справе не было і няма. Тав. Ларчанка ў артыкуле «Некрасаўскія матывы ў творчасці Якуба Коласа» робіць вывад аб уплывах па аднаму слову «Душна!» (з клічнікам), якім пачынаецца адзін радок верша Коласа і верша Некрасава. Значыць таварышы паэты, ніколі не пачынайце летняга пейзажа словам «Душна» (ды яшчэ з клічнікам), бо ў вас адразу заўважаць уплывы Некрасава.

Тав. Бярозкін у артыкуле пра творчасць Пятруся Броўкі замест таго, каб узяць прыклады з паэмы «1914 год», з вершаў, дзе вучоба ў Маякоўскага дала найбольш яркія, найбольш мастацкія вобразы, радкі, строфы, рыфмы, прыёмы (а такіх у Броўкі шмат, бо ён належыць да групы пісьменнікаў, якія глыбока і па-сапраўднаму вучыліся ў Маякоўскага), бярэ, як вяршыню гэтай вучобы, шэсць няўдалых радкоў пра вайну.

Тав. Фадзееў гаварыў аб «нівеліроўшчыках літаратуры», якія хацелі-б падагнаць літаратуру пад які-небудзь адзін шаблон, хай сабе і найлепшы. У нас на Беларусі гэтае зло адчуваецца яшчэ больш моцна і адчуваецца здаўна.

Не раз прыходзілася пасылаць з праўлення Саюза спецыяльных парламенцёраў у выдавецтва, каб знаходзіць кампрамісы і вызваляць з цяжкіх рук рэдактара творы Віцьбіча, бо рэдактар гладзіў іх так, што ад стыля Віцьбіча нічога не заставалася. Меншую актыўнасць праяўляла праўленне ў абароне драматургаў, якія, адваяваўшыся, з вялікім урокам для свабоднай аўтарскай думкі і стыля, ва Упраўленні па справах мастацтваў, павінны былі вытрымаць новую бойку з рэжысёрам і дырэктарам тэатра. Іншы раз гэта бойка канчалася тым, што аўтар вымушан быў перарабляць усю п'есу ад пачатку да канца і перарабляць, часам, на капыл той п'есы, якая нядаўна нашумела і «зрабіла аншлагі» ў тэатры.

Каб не быць галаслоўным, я спашлюся на тое, як з глыбокалірычнага апавядання пра пакуты прыгоннага артыста Салаўя атрымалася п'еса пра рэзнёра, камісара ...наццатага века. Язэпа Чорнабародага, усе рухі якога на сцэне нагадвалі ведзьмака-каршуна з пастаўленага перад тым балета «Лебядзінае возера». Прыгадаю падабенства многіх сцэн «У пушчах Палесся» і ў «Партызанах», падабенства асобных вобразаў і сцэн у радзе другіх п'ес. Падобная страта індывідуальнасці пісьменніцкай творчасці магла быць толькі ў выніку даўлення звонку. Якое дачыненне мае гэта да крытыкі?

Крытыка часам дапамагала гэтай нівеліроўцы літаратуры і проста і ўкосна. Укосна дапамагала тым, што знаходзіла ў п'есах толькі абавязкова агульныя для ўсіх дасягненні і недахопы. Вазьміце крытычныя артыкулы пра п'есы (не толькі артыкулы тав. Модэля). Вы. прачытаеце, што ва ўсіх п'есах «мноства сюжэтных ліній», «няма канца», «галоўныя дзеі—па-за сюжэтам», «не ўдаліся станоўчыя вобразы». Значыць, крытыка дапамагала тым, што абыходзіла моўчкі кожнае новае слова, новы вобраз. «Адчування новага», на якое ўказваў таварыш Сталін, не было ў крытыкаў.

Пісьменнікі найбольш абражаюцца на крытыкаў з-за трох прычын: 1) несур'ёзнага падыходу да творчасці пісьменніка, лёгкадумных ацэнак; 2) зневажаючага пісьменніка тону рада крытычных артыкулаў; 3) неаднолькавасці падыходу да асобных пісьменнікаў,—яўлага замазвання адмоўнага ў творах пісьменніка, да якога крытык ставіцца, з-за якіх-небудзь прычын, станоўча і раздування недахопаў у творчасці пісьменніка, які ўспрымаецца крытыкам, зноў з-за асабістых меркаванняў, адмоўна.

Далей тав. Клімковіч, на канкрэтных прыкладах ацэнкі творчасці таварышоў Купалы, Коласа, Бядулі, Куляшова, Гурскага і сваёй п'есы «Кацярына Жарнасек», даводзіць няўважлівасць вывучэння крытыкамі аб'ектаў іх крытыкі. Ён палемізіруе з неаднаразовымі выступленнямі нашых крытыкаў адносна моладзі і напамінае, што А. М. Горкі абураўся супроць тых, хто прызнае адзіным метадам выхавання хірургію. Гэта не азначае зніжэння патрабаванняў да маладых пісьменнікаў, не азначае даравання ім слабых і сырых рэчаў, а вызначае тон крытыкі ў дачыненні да маладых пісьменнікаў.

Тав. Клімковіч аспрэчвае рад палажэнняў артыкула тав. Кучара пра «Пагібель воўка», у прыватнасці, няправільнае тлумачэнне тав. Кучарам паводзін Харкевіча «пафасам лакейства», апраўданне тых месц, якія недапрацаваны аўтарам.

Зразумела, крытыка мае права выбіраць усякі тон, бо тон—гэта «адно з выражэнняў адносін да прадмета» (Фадзееў). Аднак, не трэба забываць усёй правільнасці і своечасовасці ўказання тав. Фадзеева аб тым, што «пры ўсёй шматвобразнасці форм крытыкі нельга забываць, што крытык заклікан выхоўваць і чытача і пісьменніка. Гэта значыць, што тон яго павінен быць благародным».

Я лічу,—адзначае тав. Клімковіч,— што п'еса тав. Самуйлёнка—адна з лепшых беларускіх п'ес таму, што яна бярэ кусок нашага жыцця ў яго тыповым праяўленні, мастацка адлюстроўвае гэта жыццё (хаця смерць перашкодзіла Эдуарду Самуйлёнку дашліфаваць п'есу). П'еса мае пазнавальнае значэнне ў гэтым сэнсе, як для нас—сучаснікаў, так і для будучых чытачоў. Але хацелася-б, каб п'еса хвалявала не столькі лёсам Харкевіча і яго перажываннямі, колькі барацьбой за тыя задачы, якія паставілі перад сабою станоўчыя персанажы, каб паімка ворага апіралася не толькі на яго промахі і выпадковасці, а на моцна і разумна арганізаваную абарону краіны. Хацелася-б, каб жыццё Дабрыніна і начальніка заставы было паказана не аднабакова, не толькі ў сувязі з разгромам зграі Харкевіча, а яшчэ больш шматгранна, чым паказан Харкевіч, каб была паказана работа сакратара райкома і начальніка заставы сярод насельніцтва. Праўда, у п'есе шмат чаго ёсць і з гэтага боку. І мне здаецца, што крытыкі павінны былі раскрыць іменна гэты бок справы, а не перажыванні Харкевіча. Паўтараю, што я—за станоўчую ацэнку п'есы. І я, па праўдзе сказаць, быў здзіўлены, калі «Звязда», якая так нядаўна пісала аб «Пагібелі воўка», як аб вяршыні беларускай драматургіі, праз месяц піша пра п'есу тав. Глебкі, зноў як непрэўзойдзеную вяршыню ўсё той-жа беларускай драматургіі. І гэта не гледзячы на тое, што новую п'есу тав. Глебкі варта было-б расцаніць, як добрую п'есу, але маючую шмат сырых і недапрацаваных месц, вялікія ўмоўнасці.

Крытык павінен, як і кожны пісьменнік, ведаць жыццё, хоць-бы так, як ведае яго аўтар крытыкуемай рэчы. Інакш ацэнкі крытыка — «правільна ці няправільна» адлюстроўвае пісьменнік жыццё—будуць занадта ўмоўнымі і агульнымі.

Што трэба для таго, каб у нас знікла кан'юктурная крытыка?

Перш-на-перш патрэбна, каб нашы газеты мелі ў сваім складзе людзей, якія маглі-б самі добра разбірацца ў з'явах мастацтва і выказваць свае, незалежныя ні ад каго, погляды на сутнасць літаратурных з'яў. Гэтыя людзі, а не рэцэнзенты, пра якіх гаварыў Аляксей Максімавіч Горкі, павінны гнацца не за «арыгінальнасцю» суджэнняў, а за правільнасцю ацэнак.

Па-другое, трэба, каб самі «імёны», у дачыненні якіх тварыцца падхалімаж, рабілі так, як зрабіў таварыш Сталін з падхалімажам Лахуці.

Па-трэцяе. Патрэбна дыскусія, а не адзінаначалле ў крытычных ацэнках. У нас-жа атрымліваецца так: вышла кніга, ці пастаўлен спектакль,—адзін з крытыкаў напіша артыкул і—усё. Нязгодныя з ім не выступаюць у друку. Лічыцца дрэнным тонам, калі аўтар выступіў у друку з рэплікай крытыку (прыклад нябожчыка Макарэнкі нас вучыць адваротнаму).

У нас было дзве дыскусіі, абедзве няўдалыя. Адна вакол паэмы «Фелікс Дзяржынскі» Агняцвет, другая вакол артыкула тав. Есакова пра «Вочную стаўку», які правільна ставіў пытанне аб нізкай якасці п'есы.

Вывад: патрэбна большая незалежнасць крытыкі ад пабочных меркаванняў, ад аглядак на ўстановы і асобы. Крытыка— не суд, аднак абвяшчэнне савецкага суда незалежным, абвяшчэнне свабоды слова, устаноўка «Праўды» аб крытыцы,—усё гэта павінна быць улічана, калі мы хочам (а мы гэтага сапраўды хочам) узняць аўтарытэт крытыкі і зрабіць яе дзейсным памочнікам літаратуры. Дарэмна некаторыя лічаць, што газета можа змясціць толькі адну рэцэнзію на кнігу ці на п'есу.

Для ўздыму крытыкі пісьменнікам патрэбна выкараніць пагардлівыя адносіны да крытыкі, а крытыкам ні ў якіх выпадках «не крывіць душой». Патрэбна глыбокая работа над творам, які разглядае крытык.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ КРЫТЫКІ

Днямі адбылося пашыранае пасяджэнне праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР сумесна з пісьменніцкім актывам. На пасяджэнні абмяркоўваліся пытанні крытыкі. З дакладамі выступілі таварышы М. Клімковіч і Я. Шараховскі.

У дакладзе тав. Клімковіча пераважаў пералік пэўных фактаў, з'яў, літаратурных падзей, але не было разгорнутай характарыстыкі і аналіза крытыкі. Вельмі мала дадаў да даклада тав. Клімковіча і тав. Шараховскі.

Якасць і ўзровень спрэчак знізілі неарганізаванасць пасяджэння і адсутнасць сур'ёзнай зацікаўленасці пісьменніцкага актыва пытаннямі крытыкі. Зусім не быў скарыстан вопыт пашыранага пасяджэння прэзідыума Саюза савецкіх пісьменнікаў СССР, не былі ў дастатковай меры ўлічаны артыкулы і даклады таварыша Фадзеева аб крытыцы. Таму на праўленні ССПБ атрымалася не абмеркаванне праблем крытыкі, а хутчэй за ўсё штосьці падобнае на вузкую сямейную параду.

Шмат спрэчнага і непрадуманага было ў выступленнях асобных крытыкаў. Напрыклад, тав. Кучар імкнуўся давесці, што беларуская літаратура налічвае толькі 3—4 крытыкаў. Як бачна, тав. Кучар не заўважае, што з ростам літаратуры растуць і маладыя кадры крытыкаў, якія вучацца, авалодваюць майстэрствам сваёй справы. У другой частцы свайго выступлення тав. Кучар правільна крытыкаваў рэдакцыі газет за несур'ёзны падыход да друкуемага крытычнага матэрыяла. Тав. Кучар прывёў прыклады, калі газета «Звязда» друкуе непрадуманыя, несур'ёзныя, а часам, і непісьменныя матэрыялы аб літаратуры і мастацтве. Рэдакцыю газеты «Літаратура і мастацтва» т. Кучар, а потым і т. Бярозкін справядліва папракалі ў адсутнасці сур'ёзнай работы з крытыкамі.

Больш чым несур'ёзным было выступленне тав. Ларчанкі. Правільна супярэчачы тав. Кучару, які высунуў думку аб адсутнасці ў нас здольных маладых крытычных кадраў, тав. Ларчанка чамусьці пачаў разважаць аб ступені таленавітасці і рангу кожнага крытыка.

Найбольш змястоўным было выступленне т. Бярозкіна, які сурова крытыкаваў артыкулы тав. Модэля за іх павярхоўнасць, указаў на агляду тав. Модэля на ранг і званне крытыкуемых ім драматургаў, рэжысёраў, артыстаў. Тав. Бярозкін крытыкуе і рэдакцыю газеты «Звязда» за адсутнасць у яе прадуманай літаратурнай лініі, за друкаванне станоўчых рэцэнзій на няўдалыя п'есы і пастаноўкі («Вочная стаўка» і інш.), за лёгкадумныя адносіны да змяшчэння паасобных крытычных артыкулаў. Быў выпадак, калі ў артыкуле А. Маслоўскага аб Маякоўскім «Звязда» пісала, што ў 1917 годзе, ідучы на штурм Зімняга палаца, матросы спявалі «Левый марш». А вядома, што «Левый марш» напісан Маякоўскім у канцы 1918 года. Такія недарэчнасці сустракаюцца і ў іншых артыкулах.


Выступленне тав. І. Сярэбранага было прысвечана пытанням яўрэйскай літаратурнай крытыкі. Тав. Сярэбраны адзначыў, што нашы газеты і журнал «Полымя рэвалюцыі» вельмі мала пішуць аб яўрэйскай савецкай літаратуры, што яўрэйскім крытыкам яшчэ не створаны дастаткова спрыяючыя ўмовы для работы.

З кароткай, але змястоўнай прамовай выступіў тав. К. Крапіва, які прывёў прыклады несур'ёзных, лёгкадумных адносін паасобных крытыкаў да сваёй працы. Асноўны недахоп многіх крытыкаў,—гаворыць тав. К. Крапіва,—гэта адсутнасць культуры ў іх працы, слабая літаратурная і палітычная пісьменнасць, недастатковасць іх жыццёвага вопыта. А вядома, што толькі тады будзе карыснай і плённай работа крытыка, калі па свайму ўзроўню ён будзе стаяць не ніжэй пісьменніка, творы якога крытык разглядае.

У спрэчках таксама выказаліся таварышы Ільінскі і Грубіян.

Закрываючы пасяджэнне, старшыня праўлення ССПБ тав. М. Лынькоў адзначае, што ў абмеркаванні пытанняў крытыкі было шмат недахопаў, што да гэтай справы прыдзецца яшчэ вярнуцца не раз. Тым не менш, пасяджэнне, хаця яно і не вычарпала ўсіх, стаяўшых перад ім, задач, адыграла некаторую станоўчую ролю, і ўсе пытанні, узнятыя крытыкамі і пісьменнікамі, будуць улічаны праўленнем Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР.

Я. ГЕРЦОВІЧ.



«**Чапаеў** вядзе байцоў у атаку»— Фрагмент карціны **І. Владзімірава** для башкірскага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Фотахроніка ТАСС.

РАБОТА НАД КЛАСІКАЙ

За нашым тэатрам зацвердзілася слава своеасаблівай шэкспіраўскай лабараторыі. Мы распачалі работу над Шэкспірам у першыя годы існавання тэатра і вядзем яе ўвесь час з вялікім напружаннем і настойлівасцю. Асабіста для мяне, як для рэжысёра, іменна гэта работа над класікай супала з устанаўленнем тых асноўных прынцыпаў, якіх я прытрымліваюся на працягу ўжо дзесяці год. Першы з гэтых прынцыпаў — імкненне арганічна засвоіць славутую формулу Леніна аб адносінах новага грамадства да лепшага, што стварыла чалавецтва пад прыгнётам капіталістычнага, чыноўніцкага і памешчыцкага грамадства. Адным са шматлікіх вывадаў з гэтай геніяльнай формулы з'яўляецца імкненне паказаць найвялікшыя каштоўнасці мінулага ў іх найбольш аб'ектыўным, сапраўдным выглядзе. Формула Леніна гаворыць нам аб тым, што працоўныя Савецкага Саюза з'яўляюцца сапраўднымі гаспадарамі сусветнай культуры, што яны хочуць і маюць права азнаёміцца з лепшымі творамі мастацтва у іх арыгінальным, нескажоным выглядзе.

На першы погляд такое імкненне скоўвае, падразае крыллі фантазіі рэжысёра, які ставіць класічны твор. На самай-жа справе, гэта не так. Баяцца, што я не здолею адлюстраваць свае індывідуальныя адносіны к «Гамлету» ці «Отэлло», калі я не перараблю і не скалечу гэтыя п'есы, значыць не верыць у сілу сваёй індывідуальнасці, сваіх асабістых творчых адносін да гэтых трагедый.

Чым больш велічны твор мастацтва, да якога мы дакранаемся, тым больш несумненна, што кожны з нас, хто яго творча ўспрымае і творча аднаўляе на сцэне, абавязкова ўнясе ў яго свае асабістыя фарбы, сваю асабістую трактоўку.

Шляхам да сапраўднай і правільнай трактоўкі вялікіх трагедый Шэкспіра я лічу абавязковае разуменне яго твораў, створаных чалавекам геніяльным, але сынам свайго часу, народжаным сваёй эпохай, — чалавекам, чыю творчасць нельга зразумець штучна, без уліку рэальнай абстаноўкі шэкспіраўскай Англіі. Вялікі рэаліст Шэкспір іменна таму стварыў вобразы вечнай цэннасці, што ён ствараў вобразы людзей свайго часу і сваёй эпохі. Іменна таму заўсёды цікавы нам людзі Шэкспіра, што гэта — не абстрактныя несьбіты агульных ідэй і пачуццяў, а канкрэтныя, жывыя людзі Рэнесанса. Гамлет ненавідзіць не свет наогул, а канкрэтны свет караля Клаўдзія і яго прыдворных. Ромео і Джульетта гінуць не таму, што наогул на зямлі існуюць сваркі і варожасць, а з прычыны канкрэтнай феадальнай варожасці Капулецці і Монтэкі, здалёку нагадваючы англічанам шэкспіраўскай эпохі аб нядаўна адшумеўшых навальніцах вялікай феадальнай вайны Алай і Белай розы.

Наша трактоўка Шэкспіра ўступіла ў рэзкую барацьбу з адцягненай ідэалістычнасцю, асабліва характэрнай для буржуазнага разумення XIX стагоддзя, трактоўкі Шэкспіра, як паэтычнай спробы ўстанаўлення адцягненых, амаль алгебраічных, формул ідэалістычнай маралі і хрысціянскай этыкі.

Мы, практычныя работнікі мастацтва, акунаемся ў гісторыю ў папярэдняй фазе нашай работы, каб вызваліцца ад гісторыі, вынырнуць з яе ў момант творчага ўвасаблення вялікіх твораў класіка. Тады па-новаму ўжо адыходзіць для нас на другі план Шэкспір—сын свайго веку і паўстае на ўвесь рост Шэкспір-рэаліст, Шэкспір—знаўца чалавечага сэрца, Шэкспір-паэт і змагар за лепшыя ідэалы чалавецтва супроць фальшы, нізасці, ілжы і каварства. Іменна такім марым мы данесці нашага Шэкспіра к гледачу нашага тэатра. І я спадзяюся, што менскі глядач убачыць гэтыя чароўныя ўласцівасці выдатнага благародства і мужнасці Гамлета скрозь выкананне маладога артыста-ордэнаносца Барыса Смірнова, ці Джульетты, створанай заслужанай артысткай Тамарай Якабсон.

Я хацеў-бы са здавальненнем і радасцю падкрэсліць, што гэтыя прынцыпы работы над класікай, якімі я кіруюся ў рабоце над Шэкспірам, як у тэатры імя Ленінградскага Савета, так і ў маскоўскіх тэатрах («Кароль Лір» — у Дзяржаўным яўрэйскім тэатры, «Отэлло» — у Акадэмічным Малым тэатры) ляглі ў аснову работ над іншымі класічнымі аўтарамі, як у пастаноўках маіх вучняў і супрацоўнікаў, так і ў маіх уласных.

Імкненне найбольш поўна адлюстраваць асноўныя ідэі твора, адлюстраваць іх праз аднаўленне яго ўласнага, яму аднаму ўласцівага, стылю накіроўвала нашы творчыя імкненні і ў пастаноўцы «Вассы Железновой» Горкага (рэжысёр Е. Галавінская), і «Слугі двух гаспадароў» Гальдоні (рэжысёр Ф. Бандарэнка), і «Недарасля» Фонвізіна (рэжысёр Ігельсон), і ў маёй пастаноўцы «Прывідзенняў» Ібсена.

Усе гэтыя работы нашы мы рады паказаць сталіцы нашай брацкай Беларускай рэспублікі.

Сяргей РАДЛОЎ,
мастацкі кіраўнік тэатра імя Ленінградскага Савета.

ГОМЕЛЬСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА

Гомельская музычная школа закончыла навучальны год са значнымі дасягненнямі. З 356 вучняў, якія прайшлі веснавыя іспыты па спецыяльных прадметах, 96 маюць адзнакі «выдатна», 142—«добра», 99—«здавальняюча» і толькі 19—«дрэнна». 37 вучняў атрымалі адзнакі «выдатна» па ўсіх музычных дысцыплінах.

15 чалавек скончылі школу па спецыяльнасцях: піяніна, смычковых і духавых інструментах. Частка з іх паступае ў гомельскае музычнае вучылішча для далейшай музычнай асветы.

Канцэрт выпускнікоў наглядна паказаў поспехі вучняў.

Выступленне дзіцячага хора пад кіраваннем выкладчыцы Н. А. Піраговай паказала зладжанасць і дасканаласць мастацкай апрацоўкі выканання песень.

Паказалі свае вялікія здольнасці юныя піяністы: Ніна Файнберг (клас выкладчыка Маянца), Лена Шыфчык (клас Латышавай), Ізі Ноткін (клас Розенблюма), Нета Герман і Соня Розіна (клас Тацішчавай).

Добрае ўражанне пакінула выступленне адароных віяланчэлістаў Хайкіных, Севы і Дусі (клас выкладчыка Пеўзнера). Дарэчы, Дуся Хайкіна за адзін год прайшла праграму 4-х курсаў.

З скрыпачоў трэба адзначыць Юду Рабіновіча (клас выкладчыка М. А. Шэндэрава), Ліду Абраменка (клас выкладчыка Кузнеца), Аню Брусаванік (клас Д. Л. Шэндэрава). Веснавыя іспыты выявілі і яшчэ адну адароную скрыпачку—Лялю Рэхсон (клас Кузнеца).

У ліпені спаўняецца 20-годдзе існавання Гомельскай музычнай школы. Вялікую ролю ў арганізацыі школы ў 1919 годзе адыграў беларускі кампазітар, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР тав. Туранкоў.

Многія былыя вучні школы працягваюць сваю музычную асвету ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Менску.

Перашкаджаюць рабоце школы існуючыя яшчэ няўважлівыя адносіны работнікаў партыйных і савецкіх арганізацый горада да музычнай школы.

Школа павінна мець усе ўмовы для таго, каб і ў далейшым выхаваннем кваліфіцыраваных музыкантаў садзейнічаць росту музычнай культуры БССР.

Г. КАЧЭВІЦКІ.

Педагог гомельскага музычнага вучылішча.

„САБАКА НА СЕНЕ"

Спектакль самадзейнага драмкалектыва клуба імя Леніна

«Любоў Яравая» Трэнёва, «Слава» Гусева — такі творчы шлях драмкалектыва апошніх год, — год найбольшага роcквіту самадзейнасці гомельскага клуба імя Леніна. Папярэдняя вялікая і сур'ёзная работа над п'есамі савецкіх драматургаў падрыхтавала калектыў да пастаноўкі камедыі Лопе дэ-Вега «Сабака на сене».

«Сабака на сене» — адна з найбольш яркіх, жыццесцвярджаючых камедый вялікага іспанскага драматурга.

Ці справіўся калектыў тэатра і рэжысёр яго тав. Аграняну са сваёй складанай і пачэснай задачай?

На гэта красамоўна адказвае глядач, які з цікавасцю і захапленнем прымае спектакль.

Глядач весела смяецца над саслоўнымі прадрассудкамі графіні Дзіяны, якая не смее адкрыцца ў каханні да слугі—сакратара Тэадора. Глядач асуджае самазадаволенага графа Рыкардо і з захапленнем сочыць за ўчынкамі хітрага, плутаватага, але жыццёва-мудрага Трыстана.

Цэнтральную ролю камедыі — ролю Дзіяны выконвае тав. Бабакова (бухгалтар упраўлення Беларускай чыгункі). Трэба сказаць, што раскрыццё асноўнай ідэі камедыі амаль цалкам залежыць ад правільнай трактоўкі і мастацкай праўдзівасці гэтага складанага, супярэчлівага вобраза. Тав. Бабакова зразумела сваю ролю і знайшла правільныя сродкі для яе трактоўкі. Яна шчыра перадае двaістасць вобраза.

Нажаль, тав. Бабакова не знайшла яшчэ дастаткова выразных і пераканальных сродкаў для паказу барацьбы пачуццяў ганарлівай графіні і закаханай жанчыны, з-за чаго яна іншы раз парушае агульны план усяго вобраза.

Цікавы вобраз гарачага і страснага юнака, сакратара Дзіяны—Тэадора стварыў слесар дэпо тав. І. Кананові́ч.

Марсела, служанка Дзіяны, задумана аўтарам, як жыццярадасная, тэмпераментная дзяўчына. Зусім інакш трактуе Марселу тав. Міхайлава. Марсела ў Міхайлавай атрымоўваецца некалькі бязвольнай і бездапаможнай. Рэжысёр і выканаўца— Міхайлава пайшлі не па лініі пераманання пяжкасцей у раскрыцці гэтага вобраза камедыі, а палічылі за лепшае прыстасаваць Марселу Лопе дэ-Вега да недастаткова вопытнай выканаўцы. З-за гэтага зроблены і значныя скарачэнні тэкста ролі Марселы, што адбілася на ўсім вобразе, які атрымаўся невыразным.

Красачную фігуру слугі Трыстана стварыў тав. Пруднікаў. Глядач добра прымае кожнае з'яўленне зваротлівага, заўсёды жыццёрадаснага, Трыстана і разам з ім смяецца над яго ўчынкамі. Але адсутнасць пачуцця меры прывяла гэтага маладога і здольнага актора к найгрышу, што значна зніжае мастацкую вартасць вобраза.



Тав. **І. Кананові́ч** у ролі Тэадора і тав. **Л. Бабакова** ў ролі Дзіяны.

Фота С. Гуца.

Залішне шаржыраваны і таму недастаткова пераканаўчы вобраз маркіза Рыкардо стварыў тав. П. Ліпніцкі.

Адным з істотных недахопаў многіх выканаўцаў з'яўляецца адсутнасць беражлівых адносін к пудоўнаму вершу Лопе дэ-Вега, з-за чаго не ўвесь тэкст даходзіць да гледача.

У афармленні спектакля адчуваецца вялікая любоў да сваёй справы работнікаў калектыва. Сур'ёзныя адносіны гэтага самадзейнага калектыва да афармлення спектакля — прыклад для ўсёй нашай самадзейнасці.

Спектакль «Сабака на сене» паказвае творчы рост маладога, здольнага калектыва клуба імя Леніна.

В. БЕЛКІН, В. СТЭЛЬМАХ.

ЗАКОНЧЫЛІСЯ ГАСТРОЛІ ЛЕНІНГРАДСКАЙ КАПЕЛЫ

18 чэрвеня ў Віцебску закончыліся гастролі ў БССР Ленінградскай акадэмічнай дзяржаўнай капелы пад мастацкім кіраваннем А. В. Свешнікава. Капела дала 21 канцэрт працоўным Менска, Барысава, Слуцка, Бабруйска, Гомеля і Віцебска і 6 шэфскіх канцэртаў, выступаючы непасрэдна ў часцях БАВА. Байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі высока ацанілі работу капелы і далі на імя тав. Молатава і тав. Мехліса тэлеграмы, у якіх выказваецца падзяка савецкаму ўраду за паказ капелы ў БССР.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР запрасіла на некаторы час для работы з хорам Белдзяржфілармоніі мастацкага кіраўніка капелы засл. арт. рэсп. А. В. Свешнікава. Тав. Свешнікаў пазнаёміцца са становішчам хора, дасць практычныя рэпетыцыі пад сваім кіраваннем і правядзе рад метадычных гутарак.



Удзельнікі 4-й алімпіяды мастацкай самадзейнасці калектываў Белкаапромсовета—стаханаўцы арцелі «Гомтэкстыль» Злева направа: (першы рад) **М. Бабкова, М. Лапуноў і Н. Касперовіч;** (другі рад) **В. Недалугіна і Л. Дзяржковіч;** (трэці рад) **О. Катлярова, І. Калодзін і Д. Чэрнаштанава.**

Фотахроніка БЕЛТА.

ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ

Пабудаваны і адкрыты да XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі клуб дрэваапрацоўчага камбіната ў Бабруйску з'яўляецца сапраўдным палацам культуры. Выдатная зала на 700 месц, пакоі адпачынку, чытальня, пакоі для масавай работы абсталяваны прыгожай мэбляй, дыванамі, гардзінамі. Тут створаны найлепшыя ўмовы для культурнага, карыснага і вясёлага адпачынку.

Пры клубе разгорнута работа гурткоў мастацкай самадзейнасці. Працуюць гурткі: драматычны, харавы, струнны, у якіх займаюцца рабочыя камбіната, фанернага завода імя Кірава і завода № 4.

Вялікай папулярнасцю сярод рабочых карыстаецца харавы гурток. У яго складзе 29 чалавек. Кіруе ім хормайстар тав. Радонскі. Гурток не раз выступаў на сцэне клуба, дэманструючы свае дасягненні. У рэпертуары—песні: «Вінтоўка», «Кацюша», «Лянок» і інш. Гурток неаднаразова выступаў па радыё.

Драматычны гурток паказаў п'есу «Мая маці», скетч «На старай дачы» і інш.

У клубе сістэматычна дэманструюцца кінофільмы. За апошні час паказаны фільмы: «Пётр І» (другая серыя), «На граніцы», «Выбаргская старана», «Шчорс», «Танкісты».

Бібліятэка клуба налічвае каля 6 тысяч кніг. На павелічэнне кніжнага фонду ў гэтым годзе адпушчана 24 тысячы рублёў.

Агульны бюджэт клуба ў гэтым годзе складае 330 тысяч рублёў. **І. Н. УСАЎ.**

ЮНЫЯ МАСТАКІ

У Талькаўскай сярэдняй школе Пухавіцкага раёна працуе гурток юных мастакоў.

На занятках гуртка ўжо абмеркаваны карціны і малюнкі вучняў 8 класа Уладзіміра Габрыэльчыка, Аляксандра Бітуса і Івана Падалякі.

...Шырока раскінуўся пажоўклы стэп. Уперадзе—бурная рачулка. Ззаду скалы Уральскіх гор. На белым кані, з шашкай у руцэ, імчыцца наўздагон адступаючаму ворагу народны герой Васілій Іванавіч Чапаеў. За камандзірам імчацца байцы. Вось кароткі змест карціны здольнага юнага мастака Аляксандра Бітуса «Чапаеўская дывізія наступае на Калчака».

Не менш цікавыя карціны Івана Падалякі «Пагранічнікі ў дазоры» і «Каля лесу». Удала намаляваны ім партрэты В. І. Леніна і С. М. Кірава.

Шмат добрых малюнкаў зрабіў Уладзімір Габрыэльчык на тэму «Жыццё Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота». Яго работы вызначаюцца свежасцю тэмы і прастатой сюжэта.

А. ПАРМОН.

Талька.

ЗА САПРАЎДНЫ ТВОРЧЫ РОСТ

9 чэрвеня калектыў Рагачоўскага калгасна-соўгаснага тэатра на агульным сходзе абмеркаваў вывады журы фестываля калгасна-соўгасных тэатраў.

Для Рагачоўскага тэатра фестываль адыграў надзвычай вялікую ролю ў вызначэнні правільнага шляху для далейшага творчага росту.

Спектаклі Рагачоўскага тэатра «Егор Булычоў» і «Дура для іншых, разумная для сябе» не даносяць, не ўскрываюць глыбіні мыслі і багацця ідэй аўтараў. Прычына гэтага, паводле думак выступаўшых таварышоў,—няправільны метад работы мастацкага кіраўніка тэатра, пастаноўшчыка спектакляў, А. І. Лізункова. У пагоні за складаным рэпертуарам, тав. Лізункоў ставіў п'есы, якія былі яму не пад сілу. Вобразы п'ес трактаваліся прымітыўна, павярхоўна. Асноўны ўпор рабіўся пастаноўшчыкам на вонкавы эфект.

Тав. Лізункоў не клапаціўся аб выхаванні калектыва і фактычна з'яўляўся не мастацкім кіраўніком тэатра, а толькі пастаноўшчыкам спектакляў.

Замест прызнання сваіх памылак, замест правільнай арыентацыі калектыва тав. Лізункоў дагэтуль катэгарычна адмаўляе правільнасць заўваг журы фестываля.

Зараз калектыў тэатра, безумоўна, мае ўсе магчымасці для далейшага правільнага росту. Калектыў жадае энергічна і плённа працаваць.

У тэатр запрошан на пастаноўку рэжысёр тав. Рэшымаў, які будзе ставіць п'есу Эд. Самуйлёнка «Пагібель воўка». Адначасова будуць дапрацаваны спектаклі існуючага рэпертуару.

Барыс САВІЧ.

АДКРЫЦЦЁ КАРЦІННАЙ ГАЛЕРЭІ Ю. М. ПЭНА Ў ВІЦЕБСКУ

12 чэрвеня ў былой кватэры Ю. М. Пэна адкрылася карцінная галерэя імя гэтага выдатнага мастака.

У двух пакоях, дзе жыў і працаваў Ю. М. Пэн, выстаўлены лепшыя яго палотны, якія характарызуюць асноўныя этапы творчага шляху мастака. З вялікім майстэрствам ён адлюстраваў у сваіх працах быт працоўных яўрэяў дарэвалюцыйнага і нашага часу.

З палотнаў дарэвалюцыйнага часу асабліва моцнае ўражанне пакідае ў гледача карціна «Развод», напісаная ў 1912—13 годзе. З вялікім майстэрствам перададзены мастаком характэрныя для таго часу звычаі і норавы местачковага насельніцтва.

У пакоі, дзе выстаўлены работы паслярэвалюцыйнага часу, асабліва вылучаюцца выкананыя з вялікай любоўю і майстэрствам карціны «Штукатур», «Хлебапёк», «Кравец», «Майстар гадзіннікаў», «Краўчыха», «Малады шавец-комсамолец чытае гарадскую газету «Заря Запада», «Яўрэй-калгаснік», «Піонер».

У цэнтры галерэі выстаўлен аўтапартрэт мастака, які зроблен ім у 1922 годзе.

У двух пакоях выстаўлена толькі восьмая частка таго, што напісана мастаком. Ім напісана звыш 800 работ. Шмат каштоўных работ Пэна немагчыма выставіць у гэтым памяшканні. Віцебскаму горсавету і абласному аддзелу мастацтваў неабходна прыняць захады да таго, каб перадаць для галерэі ўсе пакоі дома, дзе жыў Пэн. Тады музей здолее выканаць задачу шырокай папулярызацыі творчасці вялікага мастака.

Г. МАКСІМАЎ.

БУДЫНАК КАРЦІННАЙ ГАЛЕРЭІ БССР

Дзяржаўная карцінная галерэя БССР атрымала па вуліцы Карла Маркса новае памяшканне (былы інтэрнат Вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школы БССР).

З 1 ліпеня пачнецца рамонт будынка. Рамонт працягнецца 2 месяцы. Карцінная галерэя будзе мець звыш 1500 кв. метраў плошчы.

ШКОЛА АКТОРАЎ

Перад невялікай групай гледачоў з'яўляюцца героі твораў Гогаля, Мальера, Ібсена... Студэнты рэспубліканскага беларускага тэатральнага вучылішча паказваюць свае поспехі ў галіне авалодання майстэрствам актора. Здаюць экзамен студэнты класа тав. Галаўчынера — Говар-Бандарэнка, Зенькоўскі, Міронычык, Стасевіч, Іваноў, Кагановіч, Путырская.



Сцэна з п'есы «Нора» Ібсена. Выканаўцы — студэнты **М. Міронычык і А. Говар-Бандарэнка.**

Фота І. Каплінскага.

Экзамены паказваюць, што вучылішча выхоўвае таленавітую моладзь.

Студэнтка 2 курса Анна Прашковіч удзельнічала ў абласным конкурсе чытальнікаў, які праводзіўся ў Менску. На конкурсе яна заняла адно з першых месц.

Тэрмін навучаня на асноўным, драматычным, аддзяленні вучылішча — 5 год. Праграма гэтага аддзялення ўключае агульнаадукацыйныя і спецыяльныя прадметы. Да апошніх адносяцца: майстэрства актора, тэхніка сцэнічнай мовы, рытміка, грым, гісторыя тэатральнага мастацтва і інш.

Пры вучылішчы ёсць балетнае аддзяленне і паўтарагадовыя курсы па падрыхтоўцы актораў для калгасна-соўгасных тэатраў.

Зараз у тэатральным вучылішчы навучаецца 125 чалавек. Многія з іх прышлі з фабрычна-заводскіх, калгасных самадзейных драмгурткоў, з сярэдніх школ.

Тав. Говар-Бандарэнка прыехаў у вучылішча з Сярэдняй Азіі. Служыў у Чырвонай арміі. Праявіў сябе ў армейскім драмгуртку. Паступіў Говар-Бандарэнка на першы курс, але дзякуючы добрай паспяховасці ў другім паўгоддзі быў пераведзен на другі курс. Зараз усе дысцыпліны ён здае на «пяцёркі».

З усмешкай успамінае Е. І. Кавалеўскі аб тым, як на школьнай сцэне ён выступаў у самадзейным гуртку і выконваў ролю Дзімітрыя з «Барыса Гадунова». З маленства палюбіў ён тэатр. Завучваў маналогі з розных драматычных твораў і марыў стаць акторам. У мінулым годзе ён скончыў менскую 45 сярэднюю школу і паступіў на першы курс вучылішча. Зараз тав. Кавалеўскі паспяхова здае залікі. Без адрыву ад вучобы тав. Кавалеўскі разам з іншымі выдатнікамі вучылішча ўдзельнічае ў пастаноўках Белдзяржрамтэатра, уваходзячы у дапаможны склад.

П. В. Малашкевіч прыехаў у вучылішча з Бярэзінскага раёна, з калгаса імя Тэльмана. Ён скончыў Віцебскі тэкстыльны тэхнікум. Зараз тав. Малашкевіч настойліва авалодвае майстэрствам актора і ўзбагачае сябе ведамі.



Сцэна з п'есы «Мешчанін у дваранстве» Мальера. Выканаўцы — студэнты **Н. Путырская і Іваноў.**

Тэатральнае вучылішча мае кваліфіцыраваны педагагічны склад. Сцэнічную мову выкладае педагог Тушмалава. Педагогам па музычных дысцыплінах з'яўляецца кампазітар Цікоцкі, па рытміцы — Лімонэ. Іншыя дысцыпліны выкладаюць педагогі Румянцаў, Юдалевіч, Леангардт, засл. арт. БССР Васільева кіруе балетнай групай.

Але не створаны яшчэ ўсе ўмовы, патрэбныя вучылішчу. Вучылішча не мае спецыяльнай залы для практычных заняткаў. Гэтая зала, як і некаторыя аудыторыі, адданыя вучылішчу, заняты майстэрнямі Тэатра оперы і балета. Няма інтэрната. Ёсць пагроза, што пабудова яго не будзе скончана да будучага навучальнага года. Большай увагі з боку Упраўлення па справах мастацтваў патрабуе тэатральнае вучылішча.

А. ГЕЙНЕ.

МЕНСКІ БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТР ПРЫСТУПІЎ ДА РАБОТЫ

Калектыў Менскага Белдзяржрамтэатра 21 чэрвеня вярнуўся з адпачынку і прыступіў да падрыхтоўкі к дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Тэатр будзе працаваць над п'есай К. Крапівы «Хто смяецца апошнім», а таксама дапрацоўваць спектаклі: «Апошнія», «Партызаны» і «Пагібель воўка». Усе гэтыя спектаклі будзе кансультыраваць рэжысёр МХАТ'а, засл. арт. рэсп. ордэнаносец І. М. Раеўскі.

У ПРАЎЛЕННІ ССП БССР

Гэтымі днямі адноўлен у правах члена Саюза савецкіх пісьменнікаў і члена праўлення ССП БССР пісьменнік тав. Кузьма Чорны. Адноўлен таксама ў правах члена Саюза савецкіх пісьменнікаў тав. Мікола Ільінскі.

У члены Саюза савецкіх пісьменнікаў прыняты крытыкі Я. Шарахоўскі, А. Маслоўскі і маладыя пісьменнікі А. Стаховіч, Е. Садоўскі. Пераведзен з кандыдатаў у члены ССП БССР тав. Целесін.

Не помнік, а карыкатура

Ужо месяц, як у Віцебску, на Пушкінскай вуліцы, пастаўлен, з дазволу сказаць, помнік А. С. Пушкіну. Гэты помнік з'яўляецца здзекам над памяццю вялікага паэта.

Фігура Пушкіна (скульптар Аўчыннікаў) зроблена карыкатурна, — пад плашчом не адчуваецца левага пляча, пясць левай рукі недарэчна вялікая, яшчэ больш вялікай зроблена правая рука, амаль адсутнічае шыя і таму фігура здаецца гарбатай. П'едэстал не звязан кампазіцыйна з фігурай ні па форме, ні па размерах і нагадвае звычайны комін. Больш чым зразумела, што такі «помнік» не стварае велічнага вобраза паэта і не мае з ім ніякага падабенства.

Не гледзячы на энергічныя пратэсты Віцебскага абласнога ўпраўлення па справах мастацтваў помнік стаіць дагэтуль. Старшыня Віцебскага горсовета тав. Багрыноўскі пераслаў нарэшце справу з помнікам, як сведчыць амаль-што гістарычная рэзалюцыя, «на разгляд горкамгасу».

Мы перадаем гэтую справу на разгляд нашай грамадскасці і ўпэўнены, што Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР прыме ўсе меры, каб гэты збуральны помнік быў заменены іншым, вартым памяці геніяльнага паэта.

Ю. ВІЦЬБІЧ.

Хроніка

◆ Слуцкі калгасна-соўгасны рускі тэатр прыняў да пастаноўкі п'есу З. Бядулі «Салавей». Ставіць п'есу С. Б. Тураў, мастак — Марыкс, кампазітар Сакалоўскі, балетмайстар — Алексютовіч.

◆ Згодна пастановы СНК БССР, пры Белдзяржвыдавецтве арганізуецца сектар нотных выданняў. Для задавальнення растучага попыту на нотныя выданні у кніжных магазінах гарадоў і раённых цэнтрах ствараюцца аддзелы па продажу нотнай прадукцыі.

◆ Рэпертуарная камісія Саюза савецкіх кампазітараў БССР прыступіла да прагляду музычных твораў для друку.

◆ Саюз савецкіх кампазітараў УССР прыслаў Саюзу савецкіх кампазітараў БССР спіс твораў украінскіх кампазітараў для сімфанічнага аркестра. У спісу 22 творы кампазітара Ляташынскага, Касенка, Казіцкага, Рэвуцкага і інш.

◆ Упраўленнем па справах мастацтваў створан аргкамітэт па правядзенню першага тура ўсесаюзнага конкурса артыстаў эстрады. У камітэт увайшлі народныя артысты БССР Александроўская і Уладамірскі, заслужаныя артысты БССР Рахленка, Ржэцкая, Васільева, мастацкі кіраўнік балета Ермалаеў, балетмайстар Муляр, праф. Тіханаў, дацэнт Карын, Юдалевіч, Прагін (старшыня).

◆ Пры абласных аддзелах па справах мастацтваў арганізуюцца мастацкія саветы. У функцыі іх уваходзіць дзяржаўны кантроль за якасцю жывапісу і скульптуры, якія ідуць у масавую вытворчасць і для распаўсюджвання.

„ПАГІБЕЛЬ ВОЎКА"

Віцебскі Дзяржаўны драматычны тэатр

П'есу Э. Самуйлёнка «Пагібель воўка» трэба разглядаць не як твор аб воўку-Харкевічу, але як філасофскі твор аб пагібелі воўка-звера ў свядомасці людзей соцыялістычнай эпохі.

Паказ таго, як рэзідэнт Харкевіч хавае дыверсанта, як ён служыць замежнай разведцы, як ён кіруе работай дыверсантаў Вырвіча і Міколы і, нарэшце, як яго выкрывае начальнік пагранзаставы Усенка — усё гэта толькі канва, на якой вышыты мастацкія і глыбокія па сваёй думцы ўзоры...

Калгаснікі будуюць да свята браму — не тую, якая, некалі, разам з платамі ды межамі, служыла сімвалам адмежаванасці чалавека ад усяго свету, а новую, калгасную браму, якая і «...ёсць гаспадаркі прывет, шырока адкрытыя дзверы ў гасцінную хату».

Гэта — новыя людзі. Яны любяць сваю гаспадарку, дбаюць аб ёй. І яны занепакоены тым, што праз граніцу прарваўся воўк-парушальнік, яны шукаюць яго.

Але гэтыя новыя людзі з усёй іх чыннасцю і разважаннямі знаходзяцца па-за сюжэтам п'есы. Іх настроі і адчуванні выяўляюцца не ў драматычнай дзеі, а сумiруюцца ў прамове Мірона: «Кожны ў душы воўка насіў, кожнаму смага нажывы сэрца смактала, бо не нажыцца — значыла загінуць... Многа ад тэй пары мінула гадоў. І прышла-ж пагібель воўка. Вось мы тут дружнай сям'ёй... Няма нам з-за чаго сварыцца, няма нам з-за чаго аднаму на другога нападаць, мы вольныя савецкія земляробы, багатыя ад працы сваёй...»

Такая пабудова твору вымагае ад тэатра вельмі ўважлівай і складанай работы і ў плане агульнай пабудовы спектакля, і ў трактоўцы роляў.

Трэба сказаць, што гэту задачу тэатр у асноўным вырашыў, узняўшы на належную вышыню вобраз Мірона, які нясе ідэю пагібелі звера ў свядомасці людзей.

Харкевіч у выкананні народнага артыста БССР А. К. Ільінскага — насцярожаны, напружаны ўвесь час унутраным непакоем, няўпэўнены ў кожным наступным кроку чалавек. У яго зямля пад нагамі гарыць. Гэтаму матёраму ворагу патрэбна шмат энергіі, сілы, выпрабаванай волі, каб рабіць выгляд, што ён цвёрда ступае па савецкай зямлі. З вялікім мастацкім бляскам перадае А. К. Ільінскі тое, што Харкевіч зломлены, што з яго «вышла ўся пара», калі ён даведваецца ад Усенкі пра арышт сваіх супольнікаў. Да заслугі актора трэба аднесці пераканаўчасць і мастацкі такт у раскрыцці варожай дзейнасці панскага халуя Харкевіча.

Нажаль, на нашу думку, А. К. Ільінскаму перашкаджае ў выкананні ролі адсутнасць вартых партнёраў, якімі з'яўляюцца па п'есе дачка Харкевіча — Наста і супольнікі Вырвіч і Мікола. Яны ў сутычках з Харкевічам не маюць такой сілы, якая-б прымушала актора шукаць яркія сцэнічныя сродкі для супроцьдзеяння.

Засл. арт. БССР Р. Н. Кашэльнікава не здолела стварыць вобраз Насты, студэнткі савецкага інстытута. Яна не раскрывае трагедыі дзяўчыны, якая пачынае сумнявацца ў сумленнасці бацькі, накаплівае падазрэнні і, раптам, убачыўшы агіднасць чалавека, якім ганарылася, якога паважала, выбухае невымернай пагардай і гневам. Паступовага нарастання пачуццяў няма ў выкананні ролі Р. Н. Кашэльнікавай. Не здолела актрыса знайсці і сапраўдных шчырых пачуццяў для расказа аб адчуваннях Насты ў часе першамайскай дэманстрацыі.

Выкананне Р. Н. Кашэльнікавай прасякнута штучным наўнічаннем, капрызнічаннем, гульнёй у маленькую дзяўчынку. Толькі ў сцэне, калі Харкевіч паказвае ёй «прыданае», актрыса ў двух рэпліках знайшла шчырыя інтанацыі.

Вырвіч — цікавы па сваёй навізне характар дыверсанта — не знайшоў адпаведнай сцэнічнай інтэрпрэтацыі ў выкананні актора І. А. Матусевіча. Вырвіч — не пераканаўчы вораг, а проста дробненькі чалавечак, які з-за сваіх асабістых дробнаўласніцкіх імкненняў і прагі да грошай зрабіўся дыверсантам. Вырвіч бачыць, што мае ў калгасе тое, чаго «і пад чарапічным дахам не меў-бы». І яму ўжо «няма ніякай рацыі» шкодзіць калгасу. Але Харкевіч моцна трымае яго ў сваіх руках. Вырвіч енчыць, просіцца, аднак звароту няма і ён вымушаны прадаўжаць сваю агідную дыверсійную дзейнасць.

Вось гэтага вобраза небяспечнага ворага ў асобе дробненькага мітуслівага чалавечка актору І. А. Матусевічу і не ўдалося стварыць. У яго выкананні Вырвіч — маленькі Харкевіч, з уласцівай апошняму рашучасцю і напорыстасцю.

Вялікая і складаная гамма перажыванняў, дадзеная аўтарам Міколу, зусім прападае ў выкананні актора Р. П. Драздова. Самаўпэўненасць да нахабства, роспач, насцярожанасць, момант раскаяння, рызыка, страх, зайздрасць, п'янае бязволле, крыўда, злоба, бандыцкае захапленне нажом, — усё гэта тоне ў абыякавасці і аднатоннасці выканання ролі акторам Р. П. Драздовым.

Мірон Бокуць — малагаваркі чалавек, які ў кожным слове нясе думку, вынашаную, сто разоў жыццём апрабаваную, нясе філасофскую думку ўсяго твора. Мірон Бокуць у выкананні засл. арт. БССР П. Н. Сяргейчыка прымушае гледача ўспрымаць п'есу інтэлектуальна, прымушае разглядаць і сюжэт яе з філасофскага пункта гледжання.

Сваім упэўненым і глыбока асэнсаваным выкананнем П. Н. Сяргейчык стварае выдатны вобраз і ўзнімае спектакль на значную ідэйна-мастацкую вышыню. Нажаль, у першай сцэне сіла Бокуця не падкрэслена адпаведнымі адносінамі да яго з боку Вырвіча.

Вельмі шчыры, пераканаўчы вобраз загадчыка конефермы Лук'яна Рабічкі стварыў актор І. І. Тупік.

Усенка — адзіны, апрача Насты, станоўчы персанаж, звязаны сюжэтна з Харкевічам, у выкананні актора А. Г. Шэлега мае толькі службовую функцыю разаблачыцеля Харкевіча. Гэты вобраз, схематычны ў аўтара, не ўзнят і акторам, які не знайшоў сцэнічных фарбаў для надання ў спектаклі гэтаму персанажу цёплых чалавечых рысаў.

Вельмі пераканаўчы тып «начальніка» стварыў актор С. В. Скальскі ў ролі Абабуркі. Гэта — самаўпэўнены вораг, які адчувае падтрымку «высокіх асоб», а потым, пасля весткі аб арышце іх, нікчэмны, разгублены слімак, ачмурэлы рызыкант, які топіць свой жах перад няўзбежным канцом у гарэлцы. Выкананне С. В. Скальскага, ад пачатку да канца даносіць да гледача Абабурку, як абагуленае, тыповае з'явішча.

Актор Л. П. Міхайлаў здолеў са службовай ролі стварыць вельмі пераканаўчы вобраз п'янага забулдыгі-багемшчыка Шышкі.

Пераканаўчы вобраз загнанага ў логава, разгубленага воўка — парушальніка Шабінскага стварыў малады актор С. А. Казлоўскі.

Схематычная фігура плакатнага ворага створана акторам А. С. Шапкіным у ролі Францевіча. Праўда, гэтаму персанажу аўтарам дадзен скупы і сухі тэкст. Але актор павінен быў ажывіць яго майстэрствам выканання.

Актор П. І. Іваноў у ролі сакратара райкома Дабрыніна даносіць да гледача вобраз партыйнага кіраўніка раёна. Аднак, у сцэне з Абабуркам яму нехапае стрыманасці і ўпэўненасці, — актор упосіць непатрэбную гарачнасць.

Актор З. С. Вялікі правільна і шчыра выконвае ролю рыбака Анісіма. Іканапіснае-ж аблічча Анісіма зусім не адпавядае мяккаму гумару ролі.

Актрыса Л. І. Мазалеўская не знайшла адпаведных сродкаў для раскрыцця вобраза Сцепаніды. Створаны ёю вобраз бледны і нецікавы. Не лепшае і выкананне ролі Данілы акторам А. М. Трусам, які не знайшоў ні пачуццяў, ні інтанацый для гэтай, тэкстуальна невялікай, але багатай рознастайнасцю перажыванняў ролі.

Старшыня калгаса Міхась Буйко ў выкананні актора Г. Я. Кавальчука ў многіх месцах пазбаўлен шчырасці, без чаго не можа быць створан вобраз гэтага чалавека, які скупы на словы і шчыры ў сваіх учынках і пачуццях. Асабліва моцна адчуваецца гэты недахоп выканання ў сцэне з Абабуркам.

Актрыса Е. І. Лагоўская стварыла вобраз маладой дзяўчыны — прыяцелькі Насты. Але гэта не той вобраз вясковай настаўніцы, які дадзен у п'есе.

Падагульваючы ўражанні ад спектакля, трэба сказаць, што ён вызначаецца няроўнасцю ў распрацоўцы асобных вобразаў і сцэн, што сведчыць аб недапрацаванасці ўсяго спектакля.

Дадатным у рабоце пастаноўшчыка — засл. арт. БССР П. С. Малчанава з'яўляецца яго імкненне зрабіць лейтматывам спектакля ідэю пагібелі воўка ў свядомасці людзей. Гэта імкненне відаць і ў распрацоўцы вобраза Мірона, і ў спробах увязаць пазасюжэтную лінію п'есы з сюжэтнай, перанясеннем сцэны Мірона і Язэпа з пятай карціны ў другую.

Пры поўнай дапрацоўцы асобных роляў, пры змене і ўдасканаленні трактоўкі некаторых вобразаў і сцэн, спектакль «Пагібель воўка» займе выдатнае месца ў рэпертуары Віцебскага Дзяржаўнага тэатра.

Алег СОЖЫН.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № Т—1320.